
Особое мнение судьи Конституционного суда М.И.Пастухова

по поводу решения об отсутствии оснований для пересмотра заключения Суда от 21 июня 1995 г. «О конституционности постановления Совета Министров Республики Беларусь от 6 апреля 1992 г. №186 «О государственных ценных бумагах бывшего Союза ССР» и от 5 марта 1993 г. №125 «О выкупе облигаций целевого беспроцентного займа 1990 года на приобретение товаров длительного пользования» (решение принято на заседании Конституционного суда 21 мая 1995 г.)

С указанным решением Суда не согласен по следующим причинам.

1.В своем заключении от 21 июня 1995 г. Конституционный суд исходил из того, что предписания, содержащиеся в постановлении Совета Министров Республики Беларусь от 5 марта 1993 г. №125, являются лишь предположением должника изменить условия погашения заемного обязательства (каковыми выступали договорные отношения граждан-владельцев облигаций и государства в лице правительства) и что должник не нарушил общих начал гражданского законодательства, предложив свои условия исполнения обязательства.

Однако многочисленные обращения граждан, бывших владельцев облигаций целевого беспроцентного займа 1990 года, во многие государственные органы, в том числе и суды, свидетельствуют о том, что предписания, содержащиеся в постановлении Совета Министров Республики Беларусь от 5 марта 1995 года №125, нельзя считать обычным предложением должника в договорных отношениях.

Данные предписания носили императивный характер и не предполагали учета воли другой стороны – кредитора. Особенно отчетливо это проявилось в Порядке выкупа облигаций государственного целевого беспроцентного займа СССР на приобретение товаров длительного пользования, утвержденном Министерством финансов и Сберегательным банком во исполнение пункта 2 постановления Совета Министров Республики Беларусь от 5 марта 1993 г. №125. В нем было прямо предусмотрено, что по истечении сроков, установленных Советом Министров Республики Беларусь для выкупа этих ценных бумаг, облигации утрачивают силу и оплате не подлежат.

Указанные обстоятельства не получили надлежащей правовой оценки Конституционного суда при принятии решения. Между тем они могут рассматриваться как новые обстоятельства, дающие основания для пересмотра решения Суда.

Совершенно очевидно, что такого рода предписания, равно как и сама форма обращения Правительства к гражданам-владельцам облигаций вынуждали последних согласиться на предложенные условия выкупа облигаций. Они могут быть расценены как принуждение и даже угроза в отношении другой стороны, что противоречит общим началам гражданского законодательства и соответствующим статьям Конституции.

2.При принятии решения по делу Конституционный суд руководствовался статьей 194 Гражданского кодекса Республики Беларусь, согласно которой односторонний отказ от исполнения обязательства и одностороннее изменение условий договора не допускается, за исключением случаев, предусмотренных законом. Однако он посчитал, что граждане – владельцы облигаций, сдавшие их на условиях, предложенных Правительством, тем самым дали свое согласие на изменение условий исполнения обязательства.

Как выяснилось, большинство граждан, сдавших свои облигации, сделали это вынужденно, опасаясь не получить возмещения.

При таких обстоятельствах предписание Правительства выкупить с 1 апреля по 30 июня 1993 г. у граждан Республики Беларусь вышеназванные облигации по нарицательной стоимости, увеличенной в пять раз, может получить иную правовую оценку, а именно: как изменение условий исполнения заемного обязательства в одностороннем порядке.

С учетом изложенных обстоятельств и принимая во внимание обращение 110 депутатов Верховного Совета Республики Беларусь, ставящих вопрос о пересмотре решения по делу, полагаю, что Заключение суда от 21 июня 1995 г. «О конституционности постановления Совета Министров Республики Беларусь от 6 апреля 1992 г. №186 «О государственных ценных бумагах бывшего Союза ССР» и от 5 марта 1993 г. №125 «О выкупе облигаций целевого беспроцентного займа 1990 года на приобретение товаров длительного пользования» должно быть пересмотрено в порядке статьи 42 Закона «О Конституционном суде Республики Беларусь».

Мнение М.И.Пастухова по вопросу о коллизиях в нормах закона и указа

В данном случае речь идет о конкуренции Закона (Жилищного кодекса) и Положения, утвержденного указом президента. В теории права этот вопрос решается однозначно: юридический акт более высокой юридической силы должен иметь приоритет. Значит, в случае коллизии (противоречия) нормативных актов следует руководствоваться нормами Кодекса.

В новой редакции Конституции вопрос о конкуренции закона и президентского акта стал более запутанным. Согласно ч.3 ст.137 Конституции, «*в случае расхождения декрета или указа с законом закон имеет верховенство лишь тогда, когда полномочия на издание декрета или указа были предоставлены законом*».

С позиции юриспруденции – это глупость, но она была возведена на конституционный пьедестал. Ведь всем известно, что президент не нуждается ни в каких разрешениях на издание своих актов и практически не считается с действующим законодательством.

Тем не менее глупость этой конституционной нормы логично исправляется в Законе «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» от 10 января 2000 г. (с изм. и доп.). В ст.2 Закона перечисляются виды нормативных актов. Декреты и указы президента оказались ниже кодексов и законов. Значит, согласно принципу верховенства права и юридической логике, акты президента должны приниматься в точном соответствии с Конституцией, кодексами и законами. В случае коллизии (противоречия) президентские акты должны признаваться неконституционными (незаконными).

Безусловно, Конституционный суд должен был обратить внимание на наличие коллизий в вышеуказанных актах. Но особенность законодательства о Конституционном суде Республики Беларусь состоит в том, что Суд возбуждает производство лишь в том случае, если к нему обратились «уполномоченные органы» (президент, палаты парламента, правительство, Верховный суд).

После принятия Закона «О конституционном судопроизводстве» от 8 января 2014 г. граждане и общественные организации получили право указывать на факты противоречий, коллизии, неясности при применении нескольких нормативных актов (ст.158 Закона). Правда, вопрос о возбуждении производства принимает сам Конституционный суд.

В вышеприведенном случае глава государства имел возможность поставить перед Конституционным судом вопрос о проверке Жилищного кодекса на предмет конституционности как в целом, так и по конкретным нормам. Однако практика нашего судебного конституционного контроля такова, что никто из «уполномоченных органов» не обращается в Конституционный суд. И это на протяжении лет десяти (с 2008 года, когда А.Лукашенко своим декретом делегировал Суду право и обязанность осуществлять предварительный контроль законов, принятых палатами парламента, до подписания их президентом).

Вот этим сизифовым трудом и занимаются нынешние конституционные судьи. Они упорно «отыскивают» нарушения Конституции в принятых депутатами законах и никак их не найдут, о чем рапортуют в посланиях о состоянии конституционной законности по итогам года.

МЕЖДУ ПРОЧИМ

Даже в России не чтят большевиков

Уважаемая редакция!

Не пойму, почему у нас до сих пор отмечаются советские праздники: 1 мая, 23 февраля, 5 мая (День печати).

В России, например, День печати отмечают в январе, когда вышел первый номер газеты «Ведомости», основанной указом Петра I.

У нас же по-прежнему в почете большевистская газета «Правда». В честь выхода ее первого номера, 5 мая, и отмечается в Беларуси День печати.

Думаю, что День печати нужно увязать с нашим первопечатником Ф.Скориной.

А 7 ноября как праздник я отменил бы. Его уже нигде не отмечают. Разве что на Кубе.

Владимир СТЕПАНИЩЕВ, житель Витебска.

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ…

И предположить не могла, что придется пережить

Уважаемый Иосиф Павлович!

Мне 75 лет. Я закончила Минский институт иностранных языков, около 45 лет отработала учителем английского языка.

Даже предположить не могла, что мне придется пережить, обратившись за помощью в госорганы!

В 2004 году я вложила свои 80 чеков «Имущество» в ОАО «Белэнергострой». На основании договора №3117 от 22 июня я стала обладателем 26 акций этого открытого акционерного общества.

В 2008 году я узнала о сумме моих дивидендов. За четыре года, с 2004-го по 2008 год, она составила 5580 (сейчас это приблизительно 56 копеек). Сумма, конечно же, ошеломила.

Спустя какое-то время я обратилась в ОАО «Белэнергострой»: почему такие мизерные дивиденды? Можно ли перевести мои акции в другое ОАО, забрать, продать и так далее? Ответа не последовало.

В 2013 году я обратилась в Комитет государственного контроля, но ответа также не последовало. Правда, пришло сообщение из Департамента по ценным бумагам, в котором сообщалось, что еще 24 июня 2010 года ОАО «Белэнергострой» реорганизовано в РУП «Белэнергострой», а меня перевели в ОАО «Бобруйскэнергомонтаж», и по всем вопросам мне рекомендовано обращаться в Бобруйск, а не в Минск.

Согласно пункту 37 Устава ОАО «Белэнергострой» от 3 мая 2007 года №928, меня как акционера должны были уведомить за 30 дней о проведении столь важного собрания в связи с реорганизацией ОАО «Белэнергострой». Но только спустя три года, 10 апреля 2013-го, меня поставили перед фактом, не предупредив, не предложив какие-то варианты, не согласовав, не уведомив, а просто, как мебель, взяли и переставили в другое ОАО.

На мои неоднократные обращения в госорганы мне строчили стандартные отписки (если кого-то это заинтересует, я вышлю все полученные из госучреждений ответы-отписки).

Помогите, пожалуйста, разобраться: правомочны ли были действия или бездействия госчиновников, которые лишили меня моих акций, а точнее – завладели ими? Я не знаю, где теперь мои акции. У меня нет никаких документов.

P.S. Если бы это был единственный случай, можно было бы рассматривать его как случайность. Но, к сожалению, это закономерность.

1.Из-за халатности, некомпетентности, безразличия госчиновников моя семья не смогла приватизировать жилье, использовав 226 чеков «Жилье».

2.Мой муж 30 декабря 2003 года вложил 86 чеков «Имущество» в ОАО «Автомагистраль» (220012, Минск, ул.Сурганова, 28), но 9 мая 2004 года он ушел из жизни. Спустя какое-то время я попыталась оформить его акции в виде наследования на сына, но дважды мои письма возвращались из-за отсутствия адресата.

Где сейчас находится ОАО «Автомагистраль»?

А что касается дивидендов, так они еще «выше». Вот какие были данные на 16 января 2013 года. За 9 лет они составили аж 6540 рублей (сейчас это 65 копеек). Это же издевательство над так называемыми акционерами! Где та справедливость, о которой часто говорит президент А.Лукашенко? Знает ли он, что творится в Департаменте по ценным бумагам и в Министерствах финансов и ЖКХ?

Вера Владимировна КОВАЛЕВА.
Витебск.

ГРУЗОПОДЪЕМНЫЙ ВОПРОС

Сколько лошадиных сил в одной лошади?

Обычно одна. Иногда меньше. А иногда и гораздо больше: кратковременно это животное может развивать мощность и до 13 лошадиных сил. Но при нормальной ритмичной работе его мощность как раз около одной.

Почему именно лошадиную силу стали использовать в качестве единицы измерения мощности? В этом «виноват» изобретатель паровой машины англичанин Джеймс Уатт (1736–1819). Ему нужно было наглядно продемонстрировать общественности, что его машина может заменить много лошадей, а для этого следовало как-то измерить работу, которую сама лошадь может произвести в единицу времени.

Проведя наблюдения на угольных копях, Уатт выяснил, что среднестатистическая лошадь способна в течение долгого времени поднимать из шахты груз весом около 75 килограммов со скоростью один метр в секунду. Понятно, что такого рода измерения могут давать очень разные результаты, поэтому появилась целое «семейство» разнообразных лошадиных сил: котловая, налоговая, электрическая, водяная, метрическая и даже британская. Покончено с этим «табуном» было в 1960 году – XI Генеральная конференция по мерам и весам приняла единую Международную систему единиц СИ (SI). В ней мощность выражается в ваттах – в честь все того же Джеймса Уатта.

ГЛАБАЛЬНАЯ ТЭМА

БЕЛАРУСКАЯ РУЛЕТКА

Прадстаўнікі дэмакратычнай грамадскасці пасля працяглых дэбатаў назвалі маршрут святочнай дэманстрацыі, прысвечанай 100-годдзю абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, – ад плошчы Якуба Коласа да плошчы Свабоды. Добра, што адмовіліся ад першага варыянта – крочыць да плошчы Незалежнасці. Дзе гарантыя, што не знайшлося б купкі загадзя падрыхтаваных правакатараў, якія палезлі б "штурмаваць" Дом урада? Снежань 2010 года забываць нельга.

Першая частка абранага маршруту нагружана вельмі глыбокай сімволікай. Помнік Якубу Коласу, Вечны агонь на плошчы Перамогі, помнік Янку Купалу. Ісці і далей, лічу, не варта. Хтосьці заўважыць, што прапанаваны мною маршрут кароткі і не адпавядае маштабу свята. Урачыстае шэсце пры дамове з уладамі можна прадоўжыць да велічнага гмаху Тэатра оперы і балета і помніка Максіму Багдановічу. Знакавае месца. Адкрываецца, ствараючы адпаведныя атмасферу і настрой, цудоўная панарама на Верхні горад з ягонымі храмамі.

Безумоўна, плошча Свабоды таксама з'яўляецца сакральнай часткай старажытнага Мінска. Адна назва чаго варта! Але тут цеснавата. Маленькі скверык, заціснуты дамамі. Месца, прыдатнае для мітынгу максімум на паўтары тысячы чалавек. Містэрыя нацыянальнага духу вымагае большай прасторы.

Святочны ўсенародны сход ля Тэатра оперы і балета павінен задаволіць і дэмакратычную грамадскасць, і афіцыёз. Кампраміс сёння неабходны, як ніколі. Знарок не заўважаць новыя фарбы ў знешняй палітыцы Беларусі было б неразумна. Ёсць два шляхі да свабоды: эвалюцыйны і рэвалюцыйны. Розніца ўсяго ў адной літары. Гэта невыпадкова, бо на самай справе ніякіх двух шляхоў няма. Ёсць адзін шлях – цывілізацыйны. Рэвалюцыя – літара "Р" – выбухае тады, калі ўзрываецца сумленне. Недарэмна вядомы класік самым рэвалюцыйным пачуццём называў сумленне. І Кастусь Каліноўскі са сваёй "Мужыцкай праўдай" гэтую пазіцыю займаў.

Я не такі наіўны, каб спадзявацца на хуткае абуджэнне нацыянальна-дзяржаўнага сумлення (мыслення) ў беларускіх чыноўнікаў. Кліенты так званай лечкамісіі, у асноўным мінчане, жывуць на 12 гадоў больш, чым шараговае насельніцтва. Не толькі таму, што карыстаюцца дарагімі заморскімі лекамі, а таму, што на рабоце не напружваюцца. Нармальны ціск. Мазгі напаўзагружаны. Паглядзіце, як наменклатуршчыкі слухаюць пад тэлекамерамі прэзідэнта. Усе нешта пішуць. Вачэй не відно. Сагнуліся ў крук. Поза эмбрыёна. Чалавек, упэўнены ў сваіх сілах і з пачуццём уласнай годнасці, так сябе не паводзіць. "Эмбрыёны" будуць задаволены, калі на Нямізе дубінкамі "пятую калону" змалоцяць. Такую радасць ім нельга дарыць. Суадносіны ў чыноўніцкім асяроддзі прыкладна такія: на аднаго ўдумнага і больш-менш адказнага – два выпадковыя. Беларуская рулетка. Каму як пашанцуе. Сцвярджаць гэта дазваляюць асабісты вопыт і прафесійныя назіранні падчас працы ў закрытай інфармацыйна-аналітычнай структуры.

Звернемся да міжнароднага кантэксту. Памятаеце, Польшча і Літва перадалі Мінску спісы беларускіх апазіцыянераў з іх банкаўскімі валютнымі рахункамі. З аднаго боку, саступка Лукашэнку, запрашэнне да перамоў, з другога – ясны сігнал для тых, хто называе сябе апазіцыяй: лішняга пылу не ўздымайце. Потым забуксавала Праграма Каліноўскага. Рэктарам Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта прызначылі чалавека без ведання беларускай мовы. Узніклі (няхай нават часовыя) цяжкасці з фінансаваннем тэлеканала "Белсат" і г.д. Вось такі беларуска-заходнееўрапейскі гандаль-піндаль. Нядаўняя блакіроўка сайтаў "Беларускі партызан" і "Хартыя'97" – прамое таму сведчанне. У гэту схему ўпісваюцца і так званыя працэсы над "Белым легіёнам" і беларускімі аўтарамі расійскага сайта "Рэгнум". Невялічкая дуля ў кішэні Захаду і яшчэ меншая – Усходу.

Палітычна-арганізацыйныя дзеянні беларускага прэзідэнта і яго бліжэйшага атачэння амаль цалкам дэтэрмінаваны знешнімі чыннікамі. Сайты закрылі, а зрабіць тое самае з беларускамоўнай "Свабодай" смеласці не хапае. Бо тут жа паследуюць даволі жорсткія санкцыі. Блогераў-русафілаў арыштавалі і засудзілі, а "вечары" У.Салаўёва, у якіх ён распальвае варожасць да братняй Украіны, перакрыць не рызыкуюць. Раптам Масква "па тэхнічных прычынах" пастаўкі нафты на 5–8 мільёнаў тон скароціць?

Што ўвогуле дзеецца на свеце? Інфармацыя, у тым ліку таксічная, нарастае ў геаметрычнай прагрэсіі, і разабрацца, што да чаго, складана. Пачнём з ЗША. Да Другой сусветнай вайны валавы ўнутраны прадукт краіны складаў 17 працэнтаў ад сусветнага, пасля вайны – 60 працэнтаў. Амерыканафобы трактуюць гэты факт наступным чынам: янкі любяць нажывацца на войнах. Абсалютная дурасць! Амерыканская мабілізацыйная эканоміка ў ваенны час запрацавала ва ўсю моц – вось і ўсё. Зараз доля ЗША ў сусветным ВУП – 24 працэнты, КНР – 14 працэнтаў.

Прэтэнзія на вядучую ролю ў свеце з боку ЗША грунтуецца на цвёрдай матэрыяльна-фінансавай аснове. Ваенны бюджэт Расіі на 2018 год амаль у чатыры разы менш, чым у Кітая, і ледзь не ў дзесяць – чым у ЗША. Зразумела, адной ваенна-эканамічнай моцы для развіцця глабальных працэсаў недастаткова. Без гуманітарнай кампаненты ніякі глабалізм не прыжывецца. Адкрытае грамадства паводле Дж.Сораса не ўсталюецца. У 1976 годзе вялікай групе вучоных Гарвардскага ўніверсітэта – цытадэлі амерыканскіх дэмакратаў – было даручана стварыць… палітычна правільнае Евангелле. Праз дваццаць гадоў праца была закончана. Ніякіх "чорных" і "белых", "левых" і "правых". Падручнік паліткарэктнасці. Адсюль – еўрапейскі мультыкультуралізм, талерантнае стаўленне да мігрантаў. Дыктатарскія і аўтарытарныя рэжымы аўтаматычна трапляюць у чорны спіс. Войны ў Іраку, Лівіі ўспыхвалі не толькі з-за нафты. Ні Хусейн, ні Кадафі, ні іншыя "харызматыкі" не ўпісваліся ў новую канцэпцыю светаіснавання. Даволі цынічна, жорстка, але такая хада гісторыі.

Пры Д.Трампу Амерыка, зыходзячы з дальнасяжнай стратэгіі – умацаванне ўласнага тылу, узяла тактычную паўзу. Каб засяродзіцца, яшчэ больш напампаваць мускулы. І глядзіце, што пачалося ў Еўропе! Албанія выступіла з прэтэнзіямі да Македоніі, Венгрыя – да Украіны... У пятнаццаці еўрапейскіх краінах голаў узнялі правыя і левыя маргіналы, разлічваючы на падтрымку Расіі: на матэрыяльную – французская папулістка Марын Ле Пен, інфармацыйна-прапагандысцкую – прэзідэнт Чэхіі Мілаш Земан. Крамлю, трапіўшы ў ізаляцыю, нічога не застаецца, як абапірацца на "еўраскептыкаў", палітычных аўтсайдараў, якія ў сваю чаргу разлічваюць на падтрымку кансерватыўна-патрыярхальных груп насельніцтва. За таго ж састарэлага Мілаша Земана прагаласавалі пераважна жыхары невялікіх паселішчаў. У Польшчы, наадварот, раскачагарылі моладзь. Расійскі паліталаг Л.Млечын піша: "60 тысяч маладых палякаў трыумфальна ішлі па Варшаве, выкрыкваючы "Зіг хайль і смерць ворагам Айчыны!". Крыху раней палкоўнік У.Марахоўскі, галоўны рэдактар часопіса "Арсенал Отечества", эксперт Ваенна-прамысловай камісіі РФ, выказаўся на расійскім дзяржаўным тэлебачанні: "Мы нават не былі б супраць, каб Польшча вярнула сабе землі Заходняй Украіны, якія належалі ёй да Другой сусветнай вайны".

Амерыканцы "пакінулі" Еўропу не надоўга. Суцішыць знешнюю хаду іх змушае кітайскі фактар. Хочаш не хочаш, а дзяліцца лідарствам трэба. Летась паміж ЗША і КНР заключаны дзелавыя пагадненні на 253 мільярды долараў. Кітайцы ўклалі ў каштоўныя амерыканскія паперы звыш трыльёна долараў. Тысячы амерыканскіх вучоных жывуць і працуюць у Паднябеснай. Стратэгічнае збліжэнне ЗША і КНР непазбежна. Пры тым што зацятая канкурэнцыя паміж імі будзе працягвацца. Асабліва ў Паўднёва-Кітайскім моры і за ўплыў на В'етнам і Філіпіны.

Чаму Вялікабрытанія пакінула ЕС? Надакучыла непаваротлівая брусельская бюракратыя, вялікія грашовыя ўзносы, боязь наплыву мігрантаў? Яно так, але ўсе названыя прычыны маюць другасны характар. Спрацавала іншае. Ствараецца лёсавызначальны для ўсёй планеты трохкутнік: ЗША–Вялікабрытанія–Кітай. Можна і справа налева прачытаць, толькі Лондан усё роўна будзе пасярэдзіне – важны фінансавы цэнтр, лепшая ў свеце разведка, асабліва ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных адносін і, што не менш важна, у састаўленні псіхалагічных партрэтаў рознага кшталту правіцеляў. Краіна з надзвычай развітай грамадзянскай супольнасцю. Толькі ў Вялікабрытаніі могуць прызначыць міністра па… адзіноце. Звычайнай чалавечай адзіноце. Не дзіва, што першы кітайскі цягнік з кантэйнерамі, пераадолеўшы звыш адзінаццаці тысяч кіламетраў па новым Шаўковым шляху, прыбыў менавіта ў Туманны Альбіён. Потым ужо ў Францыю, Італію. Раю таксама ўважліва перачытаць матэрыялы, прысвечаныя гістарычнаму візіту кітайскага лідара Сі Цзіньпіна ў 2015 годзе ў Англію… Дарэчы, калі праўда, што Англія вырашыла фінансава дапамагчы "Белсату", то гэта неблагі знак для Беларусі.

У Расіі спадзяюцца на афармленне ваенна-палітычнага саюза з Кітаем. Яго не будзе. Мяркуйце самі. Пастаўкі РФ у КНР за 2015 год (такая структура экспарту захоўваецца па сёння): лес – 10 працэнтаў, металы – 10, рыба – 4, нафта і газ – 60 (!), астатняе, уключаючы прадукцыю ваенна-прамысловага комплексу, – 16 працэнтаў. Дадамо: унёсак РФ у сусветную скарбонку высокатэхналагічнай прадукцыі – менш за паўпрацэнта.

На магістральныя гістарычныя лініі выходзяць магутныя здвоеныя лакаматывы: ЗША–Кітай, Берлін–Парыж. На падыходзе Індыя – трэцяя эканоміка ў свеце. Каго індусы ў напарнікі падбяруць – час пакажа. Ясна адно: сур'ёзных перадумоў для трэцяй сусветнай вайны няма.

Нам, беларусам, па-сапраўднаму баяцца трэба вось чаго. Па паўднёва-заходнім перыметры Расійскай Федэрацыі тлеюць ваенна-палітычныя канфлікты. Данбас і Крым, Прыднястроўе і Нагорны Карабах, Абхазія і Паўднёвая Асеція, Кіргізія і Таджыкістан. Небяспечнай застаецца сітуацыя ў Сірыі. Для Крамля самая страшная перспектыва – значныя страты ў жывой сіле. Такая ўжо традыцыя расійская. 1905 год: рэвалюцыйныя хваляванні пасля паразы ў вайне з Японіяй, 1914–1917 гады – развал арміі і прыход бальшавікоў. У 1984 годзе незваротныя страты савецкага войска павялічыліся ўдвая ў параўнанні з сярэднегадавымі паказчыкамі. Масавы "груз 200" – цынкавыя труны – гэта, як і многае іншае, дапамагло, як ні дзіка гучыць, М.Гарбачову стаць на наступны год генсекам КПСС. Армія помніць 1987 год, калі на Чырвоную плошчу прызямліўся апэрэтачны самалёцік Руста. Яго маглі яшчэ далёка ад Масквы і пасадзіць, і збіць, але кожны раз з Лубянкі гучала каманда: не чапаць. У выніку "за праяўленую халатнасць" з Узброеных сіл было звольнена звыш ста ключавых генералаў на чале з міністрам абароны СССР Сакаловым. Армія добра памятае і жнівень 1991-га, калі яе зноў па-чорнаму падставілі. І канчаткова абясславілі ў 1993 годзе: армейскія танкі расстралялі законна абраны парламент. Пасля чаго прыватызацыя набыла адкрыта крымінальны характар. Начальнік 5-га Упраўлення КДБ (ідэалагічны нагляд) генерал арміі Ф.Бабкоў перайшоў на службу да банкіра Гусінскага. І такіх прыкладаў – процьма.

Калі б Захад хацеў нанесці Пуціну і ягонаму фээсбэшна-алігархічнаму атачэнню сакрушальны ўдар, то дзейнічаў бы не так, як ён дзейнічае зараз. Спярша было б абрушэнне цаны на нафту да 20–25 долараў за барэль. (Толькі не гаварыце пра цяперашні нафтавы хаўрус РФ і Саудаўскай Аравіі.) Адначасна пайшоў бы "груз 200" з адной ці нават дзвюх вышэй названых "гарачых кропак". І нарэшце – абнародаванне поўнага, а не выбарачнага спісу афшорных капіталаў расійскай эліты. Пакуль усё гэта знаходзіцца ў падвешаным стане. Навошта рэзаць курыцу, якая нясе залатыя яйкі? Сёння цана на нафту вагаецца ў раёне 70 долараў за барэль. Усё, што вышэй за 40, Расія ўкладвае ў замежныя каштоўныя паперы, пераважна амерыканскія. Сотні мільярдаў!

Дык чаму ўсё-такі Захад не ідзе на сапраўдную канфрантацыю з Крамлём? Няўжо толькі фінансава-эканамічная выгада перашкаджае? Не толькі. 22 мільёны расіян – за рысай беднасці. Яшчэ столькі набліжаюцца да гэтай ганебнай рысы. Сацыяльнае расслаенне жудаснае. Некалькі знешніх штуршкоў, паслядоўна выбудаваных, і... Не, рэвалюцыі ў класічным выглядзе не будзе. Грымне ваенна-нацыяналістычны пераварот. Апошні рэзерв матухны-Расіі. Аднак ваенную хунту Пуцін не ўзначаліць. Ён з іншага цеста і застанецца на пасадзе да поўнай фізічнай знямогі. Як Брэжнеў, Андропаў, Чарненка... Гэта выгадна Захаду, Кітаю. Патэнцыяльна моцны канкурэнт застаецца па-за гульнёй.

Імавернасць "каляровай рэвалюцыі" ў Расіі блізкая да нуля. Крэмль пойдзе на сур'ёзныя перамовы з аб'яднанай лева-правай апазіцыяй толькі тады, калі ў цэнтры Масквы збярэцца каля мільёна дэманстрантаў. Для Мінска хопіць 100–150 тысяч. Пакуль што такімі лічбамі не пахне. Выходзіць, трэба скласці рукі і чакаць з мора надвор'я? Не, канечне. Беларускім дэмакратам неабходна выпрацаваць стратэгію з улікам новай геапалітычнай сітуацыі. На мой погляд, найважнейшай сёлетняй задачай з'яўляецца святкаванне 100-годдзя БНР. Трыццацітысячнае мірнае шэсце (калі такое будзе) умацуе надзею на лепшую будучыню. Улада дзеля свайго выжывання змушана будзе развітацца з уласнымі палітычнымі лузерамі накшталт старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Л.Ярмошынай. Вось яе нядаўняя публічная заява: "Прэзідэнцкія і парламенцкія выбары не сумяшчаюцца, таму што гэта расхістванне асноў улады. І тут можна сэканоміць так, што страціць наогул усё". Выбары расхістваюць уладу? Бачыце, яны ўласнага ценю пачынаюць баяцца. І будуць чапляцца за міліцэйскую дубінку, як за саломінку. Ні малейшай падставы для ўжывання сілы "эмбрыёнам" даваць нельга. Варта яшчэ і яшчэ раз падумаць пра маршрут урачыстага шэсця. Да сустрэчы на свяце!

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ.

АЛІМПІЯДА-2018

WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY

Апошні шанц

На Гульнях-2018 беларусы могуць заваяваць яшчэ медаль толькі ў біятлонных гонках.

Учора беларускі канькабежац **Ігнат Галавацюк** паказаў на Алімпіядзе 22-гі вынік у спаборніцтвах на дыстанцыі 500 метраў. Гэта быў дэбют спартсмена на Гульнях.

А сёння ў змяшанай біятлоннай эстафеце на Алімпіядзе ў Пхёнчхане выступяць **Надзея Скардзіна**, **Дар'я Домрачава**, **Сяргей Бачарнікаў** і **Уладзімір Чапелін**. Эстафетная гонка ў жанчын адбудзецца 22 лютага, а ў мужчын – 23-га. Гэта наш апошні шанц на медаль.

Нагадаем, што на ўчарашні дзень зборная Беларусі займала ў медалёвым заліку 15-е месца (1 залаты і 1 сярэбраны медалі).

Алесь СІВЫ.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

ЗОРКА ПО ІМЕНІ ГАННА

Беларускія фрыстайлісты на кожнай Алімпіядзе пацвярджаюць свой высокі клас. На гэтых Гульнях "золатам" заззяла 25-гадовая Ганна Гуськова.

Па жыцці – з Дашчынскімі

7-гадовую Ганну прывёў займацца ў секцыю фрыстайла яе бацька. Калі дакладней, то ён быў знаёмы з трэнерам **Уладзімірам Іванавічам Дашчынскім**, а ўжо той папрасіў яшчэ аднаго спецыяліста – **Юрыя Купрацэвіча** "паглядзець дзяўчынку".

Трэба сказаць, што ў дзяўчынкі і насамрэч былі неблагія дадзеныя для лыжнай акрабатыкі – сіла, гнуткасць, каардынацыя.

"І ў яе вельмі добры характар, – дадае Юрый Аляксеевіч. – *Гэта настолькі добразычлівы чалавек, што яна заўсёды гатова дапамагчы ўсім, хто побач. Таму ў яе і сяброў шмат".*

Сама Ганна называе сваім духоўным настаўнікам вядомага беларускага фрыстайліста **Дзмітрыя Дашчынскага**, які цяпер працуе трэнерам. Дарэчы, менавіта бацька Дзмітрыя, як аказалася, і даў дзяўчыне пуцёўку ў вялікі спорт.

"Дзмітрый для мне як брат – толькі старэйшы, з якім я магу параіцца па любых пытаннях, – распавядала спартсменка. – *Заўсёды з яго брала прыклад. Чалавек вельмі кампанейскі. Ён, па сутнасці, робіць тое самае, што і мы, але разам з тым умее і патрабаваць. Але гэта правільна, інакш нельга. Вось у яго я таксама хацела б больш сабранасці набрацца. У жыцці я нярэдка бываю, як у космасе, – жыву адным днём. А ў Дзімы ўсё наперад распісана".*

Праз церні…

Алімпіяда-2014 у Сочы стала для Ганны Гуськовай дэбютнай і не зусім удалай. З-за падзення спартсменка не патрапіла ў фінал, таму ёй заставалася толькі радавацца за **Алу Цупер** і **Антона Кушніра**, якія чатыры гады таму і сталі ўладальнікамі залатых медалёў.

Амаль увесь мінулы сезон дзяўчына таксама прапусціла з-за траўмы. На трэніроўцы яна няўдала прызямлілася, пашкодзіла меніск, далей была аперацыя. Некалькі гадоў таму таксама давялося легчы на аперацыйны стол з-за разрыву крыжападобнай звязкі калена.

"Па вялікім рахунку, нічога страшнага ў такіх траўмах няма, – кажа першы трэнер спартсменкі. – *Яны звычайныя для фрыстайла, праз гэта многія прайшлі".*

Вяртанне ў вялікі спорт было проста феерычным. У гэтым сезоне Ганна ў Кітаі атрымала першую перамогу на этапе Кубка свету, на спаборніцтвах у ЗША выйграла "серабро". І нават напярэдадні Алімпіяды букмекеры аддавалі 2-е месца на Алімпійскіх гульнях менавіта беларускай спартсменцы. А пра "золата", відаць, марылі толькі самыя-самыя аптымісты. У тым ліку і сама Ганна. Але ж на тое яны і мары, каб збывацца!

Пра захапленні

У дзяцінстве Ганна марыла стаць фатографам альбо журналістам. Нават паспрабавала сябе ў ролі каментатара, калі ў Раўбічах праходзіў этап Кубка свету. Але, натуральна, усё гэта было на другім плане. На першым галоўны і любімы занятак – фрыстайл.

"Нядзеля ў нас – вольны дзень, але я аддаю перавагу дамашняму адпачынку, – казала перад Гульнямі Ганна. – *Можна і з сябрамі сустрэцца, але без фанатызму і загулаў. Шкада траціць час на пустое, калі паставіла перад сабой сур'ёзную задачу. Як і любы спартсмен, хачу выйграць Алімпіяду – каб час, які аддала спорту, аказаўся патрачаным не дарэмна".*

Спартсменка таксама прызналася, што заўсёды хацела шыць адзенне і нават ужо купіла швейную машынку. І, калі з'явіцца больш вольнага часу, не супраць прайсці майстар-клас у вопытнага чалавека.

«Хлопец? Трэба, каб ён быў не басяк…»

Ганна Гуськова пакуль што вольная дзяўчына і пра свайго будучага жаніха выказваецца з жартам: *"Мне б бізнесмена якога-небудзь… Хаця гэта я так жартую. Хочацца, каб чалавек быў просты, з пачуццём гумару – вельмі сур'ёзныя не патрэбны. А галоўнае, каб быў не басяк, а займаўся якой-небудзь цікавай справай".*

Дзяўчына таксама прызнавалася раней, што збірае грошы на кватэру, каб займець уласнае жыллё.

"Увогуле, хто не хоча разбагацець? – разважае яна пра фінансы. – *Але, з іншага боку, разбагацееў – і што далей? Знікае ўсялякая матывацыя. Зараз, напрыклад, я хачу купіць апошнюю мадэль тэлефона. Збіраю грошы, набываю і хаджу задаволеная: зрабіла, што хацела. А калі ў цябе шмат грошай, якая радасць ад пакупкі? Ты нават яе не заўважыш. Вось і кватэру купіць хацелася б, але назбірала яшчэ толькі працэнтаў 80 ад неабходнай сумы. А лепш нешта выйграць, каб табе за гэта далі і кватэру, і машыну…"*

Як вядома, за залаты алімпійскі медаль Ганна атрымае ад дзяржавы 150 тысяч долараў, так што, думаю, мары дзяўчыны зараз матэрыялізуюцца. А яшчэ ў яе будзе і дадатковы падарунак. Напярэдадні Алімпіяды Ганна Гуськова і галоўны трэнер зборнай Мікалай Казека паспрачаліся: калі спартсменка патрапіць у прызёры Гульняў, то спецыяліст аддасць ёй свой заплечнік.

Мікалай Іванавіч, бяжыце ў магазін за новым заплечнікам!..

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

У ДВУХ СКАЗАХ

* * *

Падчас аперацыі па выдаленні ракавай пухліны памерам з тэнісны мяч брытанскія медыкі надрукавалі тытанавы пратэз-імплантат для замены трох рабрын і грудной клеткі на 3D-прынтары: звычайна такі пратэз робіцца са спецыяльнага медыцынскага цэменту. Аперацыя 71-гадоваму Пітэру Мэгзу працягвалася 8 гадзін.

* * *

Прэзідэнт Турцыі Раджэп Эрдаган падчас сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Злучаных Штатаў Амерыкі Рэксам Тылерсанам прапанаваў супольнае размяшчэнне вайскоўцаў на тэрыторыі Сірыі. За гэта ЗША будуць павінны дамагчыся выхаду курдскіх апалчэнцаў з раёнаў турэцка-сірыйскага памежжа.

* * *

Еўрапейскі камісар па пытаннях бюджэту Гюнтар Эцінгер адзначыў, што ў сувязі з выхадам Брытаніі з Еўрасаюза штогадовы ўзнос Германіі ў агульнаеўрапейскі бюджэт павінен быць на 3–3,5 мільярда еўра больш. Гэта звязана з неабходнасцю захоўваць выдаткі на абарону памежжа і супрацьтэрарыстычныя дзеянні.

* * *

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый заклікала ўрад Ірана тэрмінова адмовіцца ад ужывання смяротнага пакарання ў адносінах да непаўналетніх. З пачатку 2018 года па прысудзе былі пазбаўлены жыцця два хлопцы і дзяўчына, якім не споўнілася 16 гадоў; чацвёртае смяротнае пакаранне было адкладзена на два месяцы.

* * *

У Таджыкістане заснавана прэмія за ўнёсак у развіццё дэмакратыі, якая будзе ўручацца грамадзянам краіны, замежнікам, а таксама асобам без грамадзянства. Апроч грошай – 14 тысяч долараў ЗША ў эквіваленце – лаўрэат атрымае з рук прэзідэнта Эмамалі Рахмона залаты знак з рэльефным партрэтам Рахмона.

СПЕЦСЛУЖБЫ

Депутат оказался контрабандистом?

Во время рейда по задержанию контрабандистов в конце прошлой недели спецслужбами Казахстана было задержано 29 человек. Среди них оказалось несколько граждан Кыргызстана, в том числе депутат парламента страны Дамирбек Асылбекуулу.

Руководство парламента Кыргызстана уже заявило, что не будет вмешиваться в расследование дела, однако коллеги задержанного депутата по фракции «Кыргызстан» заявили, что, по их данным, Дамирбек Асылбекуулу не имеет к предъявленным обвинениям никакого отношения. Особо подчеркивалось, что задержанный депутат оказывает серьезную поддержку развитию спорта. Правда, какое именно отношение спорт имеет к контрабанде, в заявлении фракции ничего не сказано.

ПРАЗДНИКИ

День Дарения книг в Армении

Традиционно 19 февраля, в день рождения великого поэта Ованеса Туманяна, Армения отмечает День книг. Эта традиция была возрождена в 2008 году по инициативе председателя Союза писателей Армении, ныне покойного Левона Ананяна; ее активно поддержало правительство, так что сейчас праздничные торжества пройдут в десятый раз.

В этот день армяне дарят друг другу книги на родном языке, собирают библиотечки, чтобы пожертвовать их школам, больницам, пенитенциарным учреждениям и просто людям, которые не могут себе позволить купить дорогую книгу.

Как и во многих других странах, книгоиздательский бизнес в Армении переживает не лучшие времена, однако никто не стонет и не считает, что бумажная книга обречена. Армяне любят и ценят свою классику, изучают и публикуют древнее рукописное наследие, хранящееся в специальном всемирно известном архиве Матенадаран. Молодые люди считают признаком культуры объяснение в любви классическими национальными стихами. Поэтому если вы окажетесь в этот день в Ереване и вам подарят книгу на армянском языке, значит, вас воспринимают как настоящего друга.

ІХ НРАВЫ

Трамп и Рыболовлев: связь налицо?

В воскресенье французская газета Journal du dimanche опубликовала собственное журналистское расследование о том, как может быть связан действующий президент США с российским олигархом Дмитрием Рыболовлевым. В частности, по мнению JDD, как называют газету французы, следователям, изучающим связи Дональда Трампа с Россией и возможное воздействие России на избирательный процесс в США, может быть небезынтересна покупка российским миллиардером, проживавшим в Монако, в 2008 году за 95 миллионов долларов виллы Трампа в Палм-Бич, расположенного в штате Флорида.

Шикарную резиденцию сам Трамп приобрел в 2004 году за 41 миллион долларов, однако продавал ее в 2008 году в разгар ипотечного кризиса, когда в США недвижимость резко упала в цене. С точки зрения любого обычного покупателя, вилла стоила тогда не дороже, а дешевле, так что любой желающий, у кого завалялось несколько лишних десятков миллионов долларов, мог приобрести ее, поторговавшись с владельцем и сбив цену. Рыболовлев, чье состояние превышает 7 миллиардов долларов, однако не только не торговался, но и явно переплатил.

Судя по всему, «удачная покупка» настолько «интересовала» российского олигарха, что с момента ее совершения Рыболовлев ни разу не побывал на ее территории. Зато его финансы осели в кипрском «финансовом раю» в банке Bankof Cyprus, главным акционером которого являлся американец Уилбур Росс, ныне занимающий пост министра торговли в администрации Трампа.

JDD проследила также точки маршрутов, где могли пересечься пути владельца футбольного клуба «Монако» и будущего президента США. Журналисты, которые вели расследование, указали, когда самолеты Трампа и Рыболовлева садились на соседние полосы, когда яхта дочери Трампа оказывалась у берегов Хорватии в одно время с яхтой Рыболовлева и так далее. Представители Рыболовлева ограничиваются уверениями в том, что их доверитель приобрел виллу в Палм-Бич в полном соответствии с законом и без каких-либо махинаций. Однако JDD уверена в том, что таким образом Трамп, получивший в разгар кризиса за виллу намного больше ее рыночной стоимости, был спасен своим «русским другом» от разорения.

Следует отметить, что Рыболовлев считался персоной, часто использующей коррупционные механизмы для решения своих проблем. Известно, что в 2017 году он стал фигурантом крупного скандала в Монако, откуда власти порекомендовали ему уехать, что он и сделал, переместившись в Лос-Анджелес.

Белорусам, разумеется, вся эта история была бы куда менее интересна, чем специальной прокуратуре США, расследующей дело о возможной связи будущего президента мировой сверхдержавы с Россией и вмешательстве России в процесс его избрания. Но есть одно обстоятельство.

Дмитрий Рыболовлев в бытность свою фактическим владельцем «Уралкалия» неоднократно бывал в Беларуси, причем принимали его на очень высоком уровне: якобы обсуждалась возможность покупки Рыболовлевым футбольного клуба «Динамо», однако по какой-то причине эти переговоры завершились ничем, а предназначенные для этой цели 20 миллионов, от которых отказался Юрий Чиж, облагодетельствовали клуб «Монако». Зато Дмитрий Евгеньевич стал инициатором создания «Белорусской калийной компании», согласованные действия с которой «Уралкалия» по сбыту продукции позволили Рыболовлеву серьезно нарастить свой капитал. Утверждали, что именно он рассматривался официальным Минском в качестве возможного покупателя «Беларуськалия», однако давление тогдашнего вице-премьера Игоря Сечина, курировавшего в правительстве России сырьевые ресурсы, вынудило Рыболовлева продать свою долю акций в «Уралкалии» Сулейману Керимову, который считался более лояльным к Кремлю. Причем произошло это в 2010 году и совпало с внезапным прекращением давления российского руководства на Александра Лукашенко накануне очередных выборов, которые закончились, как мы помним, массовыми посадками конкурентов и руководителей их штабов.

Трудно утверждать, что давление 2010 года было каким-либо образом связано с нежеланием белорусской стороны продать пакет «Беларускалия» кому-либо из новых владельцев «Уралкалия», однако напомним: после выборов 2010 года начинаются конфликты белорусского руководства с российской компанией-монополистом, уже не принадлежащей Рыболовлеву. В 2013 году после встречи с тогдашним нашим премьер-министром Михаилом Мясниковичем происходит арест генерального директора «Уралкалия» Владислава Баумгертнера и возбуждается уголовное дело против купившего пакет акций у Рыболовлева Сулеймана Керимова.

Вся эта история породила тогда множество слухов – вплоть до того, что Рыболовлева называли одним из возможных «кошельков» ряда высокопоставленных лиц Беларуси. Однако никаких доказательств этого представлено не было.

Тем не менее скандальная история сделки Рыболовлева и Трампа вновь вводит имя миллиардера на страницы мировой прессы, а его бизнес в ближайшее время явно будет пристально изучаться многочисленными финансовыми и антикоррупционными органами Запада. Сам Рыболовлев попал в пресловутый санкционный список США, хотя бизнес у него в 2010 году был явно отнят. Может быть, мы еще прочтем много интересного – не о белорусской, так об американской власти.

Александр ФЕДУТА.

СКАНДАЛ

Матэвуш Маравецкі сказаў…

Старшыня Сусветнага яўрэйскага кангрэса **Рональд Лаўдэр** назваў "несумленнай і абсурднай" прамову прэм'ер-міністра Польшчы **Матэвуша Маравецкага** падчас канферэнцыі па пытаннях бяспекі ў Мюнхене, у якой апошні заявіў, што адказнасць за Халакост апроч немцаў нясуць таксама і яўрэі. Такое выказванне выклікала шмат эмоцый у Ізраілі. Напрыклад, прэм'ер-міністр яўрэйскай дзяржавы **Біньямін Нетаньяху** ў "Твітары" напісаў, што ў Маравецкага "ёсць праблемы з разуменнем гісторыі, а таксама адсутнасць спачування трагедыі майго народа". А побач з амбасадай Польшчы ў Тэль-Авіве невядомыя нават намалявалі фашысцкую свастыку.

Падставай для гэтых пратэстаў стаў адказ старшыні польскага ўрада на пытанне ізраільскага журналіста Ронена Бергмана, ці будуць яго лічыць злачынцам паводле новага польскага закона, калі ён скажа, напрыклад, што ягоную яўрэйскую сям'ю выдалі гестапа суседзі, якія былі палякамі. Маравецкі адказаў, што гэта не можа быць падставай для пакарання, бо злачынства робяць прадстаўнікі розных народаў – як і яўрэйскага, польскага, рускага, украінскага, не толькі нямецкага. Зразумела, што спадар Маравецкі не збіраўся такім чынам пакрыўдзіць пачуцця яўрэяў, якія сапраўды пацярпелі падчас Другой сусветнай вайны значна больш, чым іншыя народы, – і пацярпелі не таму, што нешта здзейснілі, а таму, што былі яўрэямі. Але ж атмасфера вакол прыняцця ў Польшчы папраўак да закона аб Інстытуце Народнай Памяці ў свеце настолькі напружаная, што кожнае слова, якое можа быць трактавана ў той ці іншы бок, становіцца нагодай для скандалаў на міждзяржаўным узроўні.

Нагадаем, што з усіх краін, якія адрэагавалі на змены ў польскім заканадаўстве, толькі Нямеччына паставілася да іх дастаткова спакойна. Рэакцыя Ізраіля і Украіны была вельмі жорсткая, а Дзяржаўны дэпартамент Злучаных Штатаў звярнуўся з перасцярогай наконт магчымых канфліктаў вакол пытанняў гістарычнай памяці.

Матэвуш Маравецкі быў вымушаны рэагаваць на хвалю абурэння, якая ўзнялася ў свеце. У нядзелю ён падчас тэлефоннай размовы са сваім ізраільскім калегам запэўніў Нетаньяху, што Польшча працягне дыялог з Ізраілем па найбольш спрэчных і цяжкіх пытаннях двухбаковай гісторыі, бо гэта патрэбна, каб пазбегнуць паўтораў сітуацыі, калі людзі выказваюць найгоршыя якасці сваёй натуры, як было ў выпадках калабарацыі з фашыстамі.

Маравецкі таксама пакінуў запіс у сваім "Твітары", дзе, у прыватнасці, сказаў: "Халакост, забойства яўрэяў, якое здзейснілі нямецкія нацысты, было выключна жудасным злачынствам. У тыя страшныя часы сярод усіх народаў, аднак, былі людзі, якія дэманстравалі ўчынкі вышэйшай міласэрнасці".

У СУСЕДЗЯЎ

Арыштавалі галоўнага банкіра Латвіі

Латвійскія спецслужбы правялі вобыскі ў доме і на працоўным месцы прэзідэнта Банка Латвіі **Ілмара Рымшэвіча.** Бюро па прадухіленні карупцыі і барацьбе з ёю падазрае галоўнага банкіра краіны ў карупцыі. Нягледзячы на тое, што некалькі дзён спадар Рымшэвіч заставаўся на свабодзе і нават працягваў працаваць, у рэшце рэшт яго арыштавалі. Міністр фінансаў краіны **Дана Рэйзніцэ-Озала** заклікала Рымшэвіча сысці ў адстаўку альбо прыпыніць свае паўнамоцтвы на час следства яшчэ да арышту, але ж галоўны банкір да яе не прыслухаўся. Банк Латвіі працягвае працу ў звыклым рэжыме.

Гэта найвялікшы карупцыйны скандал у Латвіі за апошнія дзесяць год. Упершыню ў ім фігуруе такі высокі службовец.

Латвійская банкаўская сістэма апошні раз узгадвалася ў заходніх медыя ў сувязі з так званай справай Магніцкага, калі юрыст Сергей Магніцкі з юрыдычнага фонду Hermitage Capital заявіў, што з расійскага бюджэту было скрадзена больш за 5 мільярдаў рублёў. Частка з гэтых грошай, як высветлілася пазней, адмывалася праз латвійскі банк ABLV. На мінулым тыдні Міністэрства фінансаў Злучаных Штатаў Амерыкі закрыла для яго доступ да амерыканскай фінансавай сістэмы, а гэта значыць, што банк не зможа пакуль што праводзіць аперацыі ў доларах ЗША.

Прэм'ер-міністр Латвіі **Марыс Кучынскіс,** які нядаўна знаходзіўся ў Мінску з візітам, паведаміў прэсе, што банкаўскай сістэме Латвіі нічога не пагражае.

НА ДАЛОНЯХ ВЕЧНАСЦІ

Пад такой рубрыкай "Народная Воля" пачынае друкаваць вялікую серыю нарысаў, прысвечаных нашай роднай старонцы, нашай мілай зямельцы, нашаму непаўторнаму краю, што завецца Беларуссю. Аўтары – вядомыя пісьменнікі ***Анатоль Бутэвіч і Уладзімір Ягоўдзік****, якія даўным-даўно шчыруюць на ніве адраджэння гістарычнай спадчыны, нацыянальнай культуры, увекавечанні слынных сыноў і дачок Айчыны, без рупнасці, адвагі, самаахвярнасці якіх не было б і нас сённяшніх.*

Заўважым, залацінкам нашай гісторыі прысвечаны не адзін твор вышэйназваных аўтараў. Шкада толькі, што яны выдаваліся ў розныя часы невялічкімі тыражамі. Таму, пачынаючы сёння серыю публікацый у "Народнай Волі" пра найбольш памятныя і значныя падзеі, якія адбываліся на нашай Радзіме на працягу многіх стагоддзяў, пра выбітных асоб, якія сваёй стваральнай працай праславілі яе на ўвесь свет, мы запрашаем усіх чытачоў газеты ў "займальнае падарожжа да вытокаў, дзе сілкуюцца карані нашага радаводнага дрэва".

Уладзімір ЯГОЎДЗІК

Крыж-Святыня

ПРЕУДРОСИНІЯ ИГУМ-ПОЛОЦКІЯ

У кожнага народа ёсць святыні, якімі мацней за жыццё даражылі мудрыя прашчуры і якія, нібыта нязгасныя паходні, асвятляюць шляхі іх нашчадкам. Для беларусаў такой святыняй з'яўляецца крыж Еўфрасінні Полацкай.

Нарадзілася святая апякунка і першаасветніца нашага народа ў сям'і полацкага князя Святаслава-Георгія, малодшага сына славутага Усяслава Чарадзея. Таго самага Чарадзея, пра якога аўтар "Слова пра паход Ігаравы" сказаў:

Калі ў Полацку
пазвоняць раным-рана
У святыя Сафіі званы,
Ён у Кіеве звон той пачуе.

Унучку Чарадзея назвалі Прадславай. Пра далейшы лёс маладой князёўны апавядаецца ў яе "Жыцці" – выдатным пісьмовым помніку старажытнабеларускай літаратуры:

"Так любіла вучэнне яна, што дзівіўся бацька яе з любові такой да навук. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць, і добрыя здольнасці да навук, і красу цялесную, бо яна была надта прыгожая абліччам. Хараство ж яе многіх слаўных князёў прыводзіла да бацькі яе: хацеў кожны з іх заручыць яе сыну свайму…" (*пераклад з царкоўнаславянскай мовы А.Мельнікава*).

Аднак Прадслава выбрала для сябе іншую жыццёвую сцяжыну. Яна прыйшла ў манастыр, дзе пастрыглася ў манашкі пад імем Еўфрасінні. І ўсё сваё жыццё прысвяціла служэнню Богу і людзям: перапісвала ўласнаручна кнігі і будавала ў родным краі храмы, вучыла грамаце дзяцей і лячыла хворых.

Менавіта па заказе Еўфрасінні мясцовы майстар-залатар Лазар Богша зрабіў надзвычай прыгожы шасціканцовы крыж. Паданне сведчыць: крыж свяціўся ў самай непрагляднай цемені, хворым вяртаў здароўе, зняверанным і знясіленым – надзею на лепшае жыццё. Каб убачыць гэты цуд на свае вочы і пакланіцца яму, у горад над Заходняй Дзвіной зблізку і здалёку прыходзілі вернікі.

У даўжыню крыж меў 51 сантыметр. Да драўлянай асновы на пярэднім і адваротным баках былі прымацаваны залатыя пласцінкі, каштоўныя камяні, намаляваныя на шкельцах-эмалях выявы святых царквы. А яшчэ крыж аздаблялі пазалочаныя срэбныя пласцінкі з надпісамі, і без перакладу зразумелымі сёння ўсім, дарослым і дзецям.

«Въ лето 6669 (у 1161 паводле сучаснага календара) покладаеть Офрасинья чьстьный крестъ въ манастыри своемь въ црькви святого Спаса. Чьстьное древо бесценьно есть, а кованье его злото и серебро и каменье и жьнчугъ въ 100 гривнъ…»

"Древо бесценьно" было таму, што ў ім знаходзілася часцінка ад драўлянага крыжа, на якім распялі збавіцеля нашага Ісуса Хрыста.

А вось дзякуючы наступнаму надпісу мы ведаем, чые ўмелыя, сапраўды залатыя рукі зрабілі адно з цудаў зямлі беларускай:

«Господи, помоги рабоу своемоу Лазорю, нареченомоу Богьши, сьделавьшемоу кресть сии црькви святого Спаса и Офрасиньи».

Акрамя гэтых двух надпісаў, майстар пакінуў праклёны зладзеям-рабаўнікам, якія адважацца ўкрасці ці сілаю забраць полацкую святыню. Лазар Богша быццам наперад бачыў: шмат разоў крыж па нядобрай волі пакідаў сцены Спасаўскай царквы, але заўсёды вяртаўся ў родны Полацк.

Перад Другой сусветнай вайною крыж знаходзіўся ў Магілёўскім музеі. Але потым, у час ваеннай віхуры, кудысьці знік.

І дагэтуль не вядома, дзе знаходзіцца народная святыня. Аднак абавязкова настане дзень, калі крыж Еўфрасінні Полацкай вернецца ў Беларусь і зноў будзе мацаваць нашу веру ў будучыню, асвятляць нам шлях да людскасці і хараства.

ШОУ-БИЗНЕС



Никита АЛЕКСЕЕВ: «Мы постараемся удивить…»

Украинский певец Никита Алексеев, известный под сценическим именем Alekseev, представит Беларусь на Международном песенном конкурсе «Евровидение-2018». Как сообщалось, он набрал наибольшее количество баллов во время национального отбора и был объявлен официальным представителем. Алексеев станет первым за всю историю представителем Беларуси на «Евровидении», не имеющим белорусских корней.

Что известно про Алексеева?

Родился 18 мая 1993 года в Киеве. Воспитанием Никиты занималась мама, медик по образованию, и ее сестра, которую он с теплотой часто называл второй матерью. Отец был против его рождения и оставил мать, когда она отказалась прерывать беременность. Отца Никита никогда не видел, но знает, что тот успешный, обеспеченный врач, проживает за рубежом, женат и воспитывает двух сыновей-близнецов. Артист говорит, что, несмотря ни на что, никогда не держал на него злобы и мечтал познакомиться с ним и братьями.

В 10–12 лет Алексеев начал усердно заниматься музыкой. Его преподавателем по вокалу был киевский педагог Константин Пона. Никита принимал участие в детском «Евровидении», но победу не одержал. На этом певец не остановился и присоединился к молодой украинской группе «Мова».

Никита Алексеев участвовал в 4-м сезоне телешоу «Голос страны» в 2014 году. В октябре 2015 года Alekseev представил песню «Пьяное солнце», которая получила награду российского телеканала RU.TV как «Лучшая композиция года».

«Песня оказалась пророческой, – рассказывал артист. – *На отдыхе в Испании, когда вместо обручения мы с моей любимой девушкой пережили расставание, я поклялся, что на студии спою ее так, что девушка пожалеет об этом. Когда мы записывали эту песню, я вложил в каждое слово свои чувства и переживания. Мне кажется, слушатели это почувствовали…»*

Почему украинский артист решил представлять Беларусь, а не участвовал в национальном отборе от своей страны?

– *В этом году меня признали певцом года в Беларуси, это большая честь для меня, и, безусловно, это стало одним из определяющих факторов, почему я принял предложение участвовать в национальном отборочном конкурсе»,* – сказал артист в интервью mk.ru.

«Мы постараемся удивить», – так говорит Алексеев о своем предстоящем выступлении на «Евровидении».

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ



Гюнешь АБАСОВА: «Не люблю себя хвалить, но жару дала!»

Артистка Гюнешь Абасова штурмует национальный отбор «Евровидения» уже 13 лет. И каждый раз мимо. У Гюнешь железный характер, поэтому она каждый раз поднимается и… начинает все заново. Ей много раз советовали даже коллеги: мол, завязывай на «Евровидение» от другой страны, ничего зазорного в этом нет, ты звезда мирового уровня, ты достойна! Но Гюнешь – патриотка. Она в Беларуси училась, выросла, живет с мужем-иностранцем и сыном. И для нее важно поехать на международный конкурс именно от Беларуси.

С одной стороны, можно позавидовать ее упорству, силе воле и терпению. С другой стороны… Это как на выборах. Идешь голосовать и думаешь, что твой голос что-то решит, изменит, что обойдется без фальсификаций. Но в каждую избирательную кампанию наступаешь на одни и те же грабли. Так и у Гюнешь с «Евровидением». Синдром страны.

– Я не люблю себя хвалить, вот честно, но жару дала! – так оценила свое выступление сама артистка.

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ



«Это не позор, это стагнация…»

Представители белорусского шоу-бизнеса неоднозначно отнеслись к выбору артиста, который поедет от Беларуси на «Евровидение». Например, заслуженный артист Беларуси **Валерий Дайнеко**, который, кстати, был председателем жюри первого этапа национального отбора конкурса «Евровидение-2018», считает так:

«Алексеев очевидно был самым слабым из десятки. Это не позор, это стагнация...»

Стоит заметить, что Дайнеко не пригласили в жюри финального этапа национального отбора, поэтому он не имеет отношения к выбору артиста Алексеева на «Евровидение».

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ДЫЯЛОГ

Міхась СКОБЛА – Алег МІНКІН: «На 25 Сакавіка я зладзіў бы ў Мінску грандыёзны вайсковы парад у моры бел-чырвона-белых сцягоў»

16–17 лютага ў Мінску праходзіў VII Міжнародны паэтычны фестываль “Вершы на асфальце”. На ім упершыню была ўручана Літаратурная прэмія Міхася Стральцова. Ёю быў ўганараваны беларускі паэт і перакладчык з Вільнюса ***Алег Мінкін****. Пасля двухдзённай насычанай фестывальнай праграмы лаўрэат завітаў у рэдакцыю “Народнай Волі”.*

«Не трэба жывасілам цягнуць людзей у прыдуманую «светлую будучыню»

– Алег, шчыра віншую з узнагародай! Што значыць для цябе прэмія Міхася Стральцова?

– Для мяне Міхась Стральцоў найперш геніяльны празаік, а тады ўжо выдатны паэт. І Стральцоўская прэмія ў маіх вачах – безумоўна, высокакаштоўная. Калісьці даўно, не ведаючы яшчэ Стральцова-празаіка, я напісаў апавяданне “Стары дом”, здаецца, пад уплывам Борхеса. А потым пачытаў стральцоўскае “Смаленне вепрука” і здзівіўся, што гэткім самым прыёмам напісання прозы даўным-даўно карыстаўся Міхась Стральцоў. Сумна, што не пазнаёміўся з ім бліжэй. Прыемна таксама было атрымаць прэмію Стральцова яшчэ і таму, што ягоная малая радзіма – усходняя Магілёўшчына, адкуль родам і я. На маю думку, Стральцоў і ягоны зямляк Андрэй Мрый – пачынальнікі наватарскіх плыняў у беларускай прозе.

– Разам з прэміяй ты атрымаў і асобнікі сваёй свежавыдадзенай кнігі “Тут мяне не было”. Навошта ты прыдумаў такую “самазнішчальную” назву? Чаму табе недаспадобы больш аптымістычныя – накшталт каратkeвічаўскай “Быў. Ёсць. Буду”?

– Назву кнізе дало аднайменнае фантастычнае апавяданне, напісанае ў форме дзённіка яшчэ ў застойныя брэжнеўскія гады. “Тут мяне не было” – гэткі надпіс галоўны герой апавядання выразаў на лаўцы ў гарадскім парку пасля таго, як ад яго сышла каханая дзяўчына. А ён толькі каханнем да яе і жыў. У шырокім сэнсе гэтыя словы сведчаць аб непрыманні героем (значыць, і мной таксама) тагачаснага ладу жыцця. Назвы кшталту “Быў. Ёсць. Буду” мне не падабаюцца. Занадта аптымістычна гучаць. Наогул, цяпер, калі азіраюся назад, бачу, што жыццё маё скрозь складалася з ілюзій, няхай сабе і прыгожых. Але такое бачанне прыходзіць толькі тады, калі глядзіш з сучаснасці ў мінулацсь...

– Ты аўтар ці не першай беларускай сацыяльнай утопіі “Праўдзівая гісторыя Краіны хлудаў” (выйшла ў 1994 годзе). У ёй расказваецца пра маленькую краіну, агароджаную такім высокім плотам, што сонца заглядае ў яе, нібы ў студню. А яе грамадзяне хлуды лічаць сябе ледзь не пупам зямлі… Ці не ўзнікала ў цябе жаданне напісаць працяг утопіі?

– “Праўдзівая гісторыя Краіны хлудаў” – гэта хутчэй антыўтопія. Адна з галоўных думак там – што нельга гвалтоўна ўмешвацца ў сацыяльныя і грамадскія працэсы, нават з самымі найлепшымі пажаданнямі. Калі не даваць жывому ўзрастаць натуральным чынам, прыспешваць падзеі, свет толькі пагаршаецца. Не трэба жывасілам цягнуць людзей у прыдуманую “светлую будучыню”. Бо на фінішы заўсёды атрымаем згоршаны свет, а нават і трагедыю. Я ў нечым прыхільнік будыйскага прынцыпу неўмяшання і ў “Гісторыі хлудаў”, і ў іншых сваіх антыўтопіях паказаў, што можа здарыцца, калі гэты прынцып парушаецца. Я не веру ў ідэю духоўнага прагрэсу людзей (не бярэм пад увагу прагрэс тэхнічны). Хутчэй духоўная прырода чалавека нязменная, дакладней, “няма нічога новага пад сонцам, чаго ўжо не было раней”. Я недзе прытрымліваюся думкі Ніцшэ, што няма ніякага развіцця, а ўсё, што з людствам адбываецца, толькі паўтор тых самых камбінацый.

«Хлопцы цэлы год мяне апрацоўвалі, а я ў адзін момант стаў беларусам – дзякуючы Караткевічу»

– Неяк ты прызнаўся, што не бачыш і не адчуваеш свайго чытача. А хіба такое магчыма – пісаць у пустэчу?

– Магчыма, чаму ж не? Мне насамрэч найперш цікавы сам акт тварэння. Гэта вельмі рэдкі стан – ён находзіць на цябе незалежна ад таго, ты па вуліцы ідзеш ці высока на рыштаваннях сядзіш. Гэты стан прыходзіць і трывае пэўны час. І ты толькі просіш Бога, каб ён не знікаў, трымаеш яго ў сабе. Ён можа пратрымацца гадзіну ці адзін дзень. У мяне бываў па некалькі дзён. Потым стан той знікае і можа месяцамі ці нават гадамі да цябе не вяртацца. Са мной так. Пры перакладах – адчуванні зусім іншыя. Тады запаляешся натхненнем паэта, якога перакладаеш. Раней, калі быў маладзейшы, імкнуўся надрукавацца. Цяпер такога імкнення няма. Можа, прыйдзе такі час, што не захочацца і на паперу пераносіць узніклыя радкі. А што да жывых кантактаў з паэтамі... Я ведаць асабіста паэтаў не хачу. Нават не хацеў бы сустрэцца з тымі, якія ўжо даўно памерлі і паэзію якіх я люблю. Напрыклад, з Анатолем Сысам. Я нават шкадую, што яго ведаў. Вершы ў яго цудоўныя – мне іх дастаткова. Хто ведае, можа быць, і пра мяне нехта так скажа.

– Ужо твая першая кніжка “Сурма” мела шмат хвалебных водгукаў у друку. Вось што пісала, напрыклад, Зоська Верас у лісце да стваральніка знакамітага Гудзевіцкага музея Алеся Белакоза ў 1985 годзе: “На мінулым тыдні Арсень Ліс прывёз мне маленькую кніжачку вершаў. Гэта цуд – не вершы! Не магу ад іх адарвацца. Мова, змест вершаў – зачароўваюць, яны нібыта просценькія, але глыбокія па змесце. Кожны вечар бяру тую кніжку – прачытаць хоць пару вершаў, глынуць свежага паветра”. Масква, Бурація, Цюмень – прыпынкі ў тваёй жыццёвай біяграфіі. А хто ці што дапамагло табе стаць менавіта беларускім паэтам?

– Яшчэ са студэнцкіх гадоў у мяне вельмі багаты збор замежнай класікі. Усякай – кітайскай, японскай, старажытнагрэчаскай, рымскай. Былі і расійскія паэты. Да выдання першай кніжкі я прыйшоў ужо спелым паэтам. Што праўда, пачынаў пісаць па-руску. Слабенькія вершыкі былі. Потым Багдановіч, які мне запомніўся са школы. Помню, прачытаў ягоны верш “Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі, сінякрылы матылёк” і з гэтымі радкамі ў галаве паехаў вучыцца ў Маскву. А вярнуўся назад ужо абазнаным у сусветнай паэзіі. А да беларушчыны прыйшоў пасля таго, як пазнаёміўся ў Вільнюсе з Вінцэсем Мудровым і Уладзімірам Арловым – яны ўжо ў той час былі свядомымі беларусамі, мелі свае суполкі. Вось яны і пачалі на мяне ўплываць. Што праўда, не вельмі паспяхова. Потым Арлоў, здаецца, параіў мне: “Пачытай Караткевіча”. А я тады працаваў у Гомелі інжынерам, каля гатэля быў шапік, дзе я і набыў кнігу Караткевіча “З вякоў мінулых”. Сеў, разгарнуў і адразу натрапіў на апавяданне “Сіняя-сіняя”. Там былы беларускі паўстанец ратуе нейкую арабскую дзяўчынку. Я прачытаў тое апавяданне, і мяне адразу прабіла беларуская свядомасць. Ад захаплення Караткевічам. Хлопцы цэлы год мяне апрацоўвалі, а я ў адзін момант стаў беларусам – дзякуючы Караткевічу. Вось самы галоўны ўплыў на мяне. Ну, а калі ўжо рыхтаваў да друку “Сурму”, мне так неназойліва, але істотна дапамог Янка Сіпакоў.

«У Вільнюсе мяне нічога не трымае, хіба прывычка»

– Даволі працяглы час ты не падаваў аніякіх вестак пра сябе. Чым займаўся ў апошнія гады?

– Апошнія гады я гастарбайнічаў на будоўлях Масквы. Цяпер ужо не гастарбайнічаю, увогуле нідзе не працую – на пенсіі. Прафесія ў мяне інжынер-электрык, на будоўлях яна заўсёды запатрабавана. Я і раней працаваў на маскоўскіх будоўлях, а трапіўшы туды ўжо з добрым досведам, стварыў брыгаду, у якой былі пераважна кіргізы і ўзбекі. Кіргізы – самыя добрыя працаўнікі, яны адказныя, менталітэт іхні блізкі да нашага. У іх менш малітваў-намазаў, яны больш гарэлкі п’юць. Дарэчы, усе масквічы здзіўляліся, як я адразу адрозніваў узбека ад кіргіза... З 1991 года (з перапынкамі) я жыву ў Вільнюсе, але сёння мяне там нічога не трымае. Хіба прывычка. Працаваць на будоўлях ці дзе яшчэ я больш не хачу. Не тое што стаміўся – проста жыццё вельмі кароткае. Хацелася б інтэлектуальна трохі папрацаваць. Напрацовак у мяне шмат, перакладаў розных, добра было б нейкія замовы мець.

– Як назіраў за табой на Стральцоўскім фестывалі, у мяне стваралася ўражанне, што ты, хоць і стаў лаўрэатам, пачуваўся там не ў сваёй талерцы. Дзясяткі паэтаў, публічныя выступленні, дыскусіі – наколькі табе цікава сустракацца з калегамі ў такім фармаце?

– На фестывалі “Вершы на асфальце” я ўжо другі раз, ён для мяне найперш пазнавальнае мерапрыемства. Вядома, і ў Літве падобныя фестывалі таксама адбываюцца, скажам, там ёсць “Паэтычная вясна” – таксама прыязджаюць паэты з розных краёў. У першыя гады жыцця ў Вільнюсе я ўдзельнічаў у такіх імпрэзах. Паўтаруся: для мяне гэта вельмі пазнавальна, паколькі цяпер я неяк адстаў ад сучаснага літаратурнага жыцця. Стральцоўскі фестываль дазволіў мне ў канцэнтраваным выглядзе адчуць, што такое сучасная паэзія, і ўбачыць многіх жывых творцаў.

«Беларускія сучасныя паэты сціплыя і палахлівыя…»

– У цябе ёсць верш “Хата”, мне ён падаецца праграмным. Эпіграфам там – радкі Францішка Багушэвіча: “Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце, не пайду да вас я, хіба у арэшце”. Для кагосьці літаратура XIX стагоддзя (ды і ладнай часткі дваццатага) безнадзейна састарэла і не можа нічога даць новым пакаленням. Ты так не думаеш?

– У псіхааналітыка Карла Юнга ёсць такі панятак – калектыўны архетып. Ён складаецца тысячагоддзямі і прысутнічае ў свядомасці кожнага чалавека. Гэта вечнае, што жыве ў нашай падсвядомасці незалежна ад таго, да якой школы ці пакалення мы належым. Калі паэт у сваёй творчасці закранае гэты архетып – насустрач яму душа адгукаецца. З Багушэвіча якраз вобраз беларускай хаты і пачаўся. Здаецца, Антон Луцкевіч пісаў, што ў паэзіі нашай перамог напрамак да патрыярхальнай вёскі – тае самае хаты. У гэту сістэму ўкладваецца і Колас, і Купала. Я пераасэнсаваў вобраз літаратурнай беларускай хаты, мне захацелася наблізіць яе да нейкай метафізікі. Хата ў нас ужо нешта метафізічнае. Я лічу, што нашы сучасныя паэты сціплыя і палахлівыя ў гэтым пытанні. Яны адважныя толькі ў рыфмаванні, у розных цікавых хадах, заклапочаны, каб іх было цікава слухаць. У чым я яшчэ раз пераканаўся на Стральцоўскім фестывалі.

– Ты пераклаў на беларускую мову кнігі польскіх класікаў Цыпрыяна Норвіда, Баляслава Лесьмяна, Леапольда Стафа. Цаню іх усіх, хоць і не магу пагадзіцца з норвідаўскімі радкамі: “Не шчыт і меч бароняць мову, а – дасканалы твор”.

– Перакананы, што любой мове не зашкодзіць і нейкае абарончае заканадаўства.

– Я працаваў таксама, верш часта чытаў нашым “змагарам за мову”. Калі ладзіліся нейкія імпрэзы, мяне стараліся выкарыстаць, каб я які-небудзь палітычны плакат прыдумаў. Ты ж паэт, казалі, напішы нам плакат... А я, наадварот, салідарны з Норвідам. Калі на мове няма выдатных твораў, нішто яе не выратуе.

«Прыняў расійскае грамадзянства, каб беспераашкодна ездзіць на заробкі»

– Ты беларускі паэт, жыхар Вільнюса і грамадзянін Расіі. Якая з гэтых трох іпастасяў выпадковая ці нават непажаданая для цябе?

– А ці ёсць што ў нашым жыцці невыпадковае? Я нарадзіўся ў самым усходнім кутку Беларусі, на Хоцімшчыне. Трохі не так перакроілі б за саветамі Беларусь, і быў бы я жыхаром Смаленшчыны без ніякага шанцу стаць беларускім паэтам. У Вільнюс мяне выпадкова прывяла рамантычная ідэя Сяргея Дубаўца адрадзіць у гэтым горадзе беларускае інтэлектуальнае і культурніцкае жыццё, у прыватнасці газету “Наша Ніва”. Цяпер з тых рамантыкаў застаўся ў Вільнюсе хіба я адзін. Мала хто ведае, але з 1991-га па 1994 год я быў грамадзянінам Літвы. Потым высветлілася, што атрымаў грамадзянства незаконна (для “законнасці” трэба было там жыць з канца 1989-га). Пару гадоў быў увогуле без грамадзянства. Абрыдла. З прыняццем расійскага тады не было ніякіх клопатаў, а з беларускім… Я значыўся ў спісах на мяжы як дысідэнт, і ў беларускай амбасадзе пра гэта ведалі. Таму прыняў расійскае, каб беспераашкодна выязджаць на заробкі. Так сталася...

– А ці хацеў бы вярнуцца ў беларускае грамадзянства? Пры якіх умовах гэта магло б адбыцца?

– Беларускае ці расійскае грамадзянствы бачацца мне сёння фармальнасцю, бо Беларусь уваходзіць у гэтак званую Саюзную дзяржаву... Дачакацца пры жыцці сапраўды незалежнай Беларусі наўрад ці ў мяне атрымаецца. А вось прыехаць у Беларусь на сталае жыхарства ўсё больш хочацца.

Алег МІНКІН нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Чарняўка Хоцімскага раёна. Скончыў Маскоўскі інстытут інжынераў сельскагаспадарчай вытворчасці (1975). Працаваў на будаўніцтве ў Бурацыі, інжынерам-наладчыкам на нафтапомпавых станцыях у Наваполацку і Гомелі, на нафтаправодах у Цюменскай вобласці (Расія). Аўтар шасці кніг паэзіі і прозы. Жыве ў Вільнюсе.

ПЫТАННЕ–АДКАЗ

Куды знік каментатар Сяргей Новікаў?

У рэдакцыю звярнуўся чытач **Валянцін Патупчык** з Брэста: *“Ужо некалькі месяцаў не чую, каб гандбольныя і футбольныя матчы каментаваў наш вядомы спартыўны журналіст Сяргей Новікаў. Не падкажаце, чым ён зараз займаецца?”*

Як паведаміў “Народнай Волі” сам Сяргей Юр’евіч, зараз ён разам з расійскімі калегамі бярэ ўдзел у арганізацыі новага праекта пад назвай “Гандбол. Хуткі цэнтр”. Натуральна, на гэты час давялося адысці ад каментатарскіх спраў і пакінуць працу ў газеце “Прессбол”.

“Думаю, праект будзе карысны для ўсяго постсавецкага гандбола і для тых, хто ім цікавіцца”, – кажа Сяргей Новікаў.

Праект «Гандбол. Хуткі цэнтр» актыўна развіваецца ў сацыяльных сетках. На старонцы будуць аўтарскія матэрыялы пра цікавыя падзеі, якія адбываюцца ў мужчынскім і жаночым гандболе, – не толькі аператыўная рэакцыя на іх, але і аналітыка, дыскусіі. За аўтарствам Сяргея Новікава ўжо выйшла некалькі матэрыялаў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ГІСТОРЫЯ ЗДЫМКА

РАССТРАЛЯЛІ з-за пісьмаў з Аргенціны…

90 гадоў таму адбылося вяселле маіх бацькоў, якое “ўвекавечыў” невядомы заходнебеларускі фатограф. На здымку відно, як прыгожа былі адзетыя маладыя, іх дру́жкі і тава́рышкі. Злева ад бацькі – стрыечная сястра маёй маці Соня Данільчык. Праваруч ад яе – стрыечны брат бацькі Іван Ягаўдзік. Каля маці – Соня Кот, леваруч ад яе – Саша Міско, дружка бацькі.

У верхнім шэрагу ў цэнтры высокі прыгожы мужчына – бацькаў сябра Косця Кот, праваруч ад яго – мая хросная Марыя, далей – Аляксей Грэцкі. Справа ад Косці – братавая маёй маці Ганна Данільчык, леваруч ад яе – Каця Троцкая і Восіп Пясецкі.

Мой бацька, Фёдар Сцяпанавіч Серада, нарадзіўся ў 1900 годзе, маці, Ганна Сцяпанаўна Данільчык, – у 1907-м. У 1915 годзе яны разам з аднавяскоўцамі былі прымусова вывезены ўглыб Расіі і параскіданы па розных губернях. Калі вайна закончылася, вярнуліся на радзіму, праўда, не ўсе. Родныя Косці Ката засталіся ў Пецярбургскай губерні. А Косця ажаніўся з Соняй, у іх нарадзіліся трое дзяцей.

У 1930-я гады Косцю пацягнула ўступіць у КПЗБ (перад самым яе роспускам). З боку СССР ішла такая мэтанакіраваная прапаганда шчаслівага і заможнага савецкага жыцця, што Косця Кот сабраўся перабірацца ў Савецкі Саюз. Яго адгаворвалі і сваякі, і ўлады: не едзь, там голад, там забіваюць бязвінных людзей… Косця не паслухаўся і паехаў – разам з жонкай. Там у іх неўзабаве нарадзілася дачка Тамара. Косця быў разумны і працавіты, маглі б і на чужыне жыць сваёй сямейкай.

Ды здарылася, што ў Восіпа Пясецкага згарэла хата. Падпальшчыкаў не знайшлі, ён атрымаў страхоўку і з’ехаў у Аргенціну. Доўгі час пісаў адтуль пісьмы сваім таварышам, у тым ліку Косці. Почырк у Восіпа быў маларазборлівы, і пасля 1939 года яго каракулямі зацікавілася НКВД, палічыўшы пісьмы з Аргенціны зашыфраванымі данясеннямі. Сям’ю Косці выкінулі з Расіі ў Беларусь, а самога яго арыштавалі за сувязь з замежжам і ў хуткім часе расстралялі.

Восіп Пясецкі ў 1952 годзе вярнуўся на бацькаўшчыну з добрымі грашыма, пабудаваў хату, але нядоўга нажыўся ў ёй – захварэў і памёр.

Вось такая гісторыя здымка. І калі “Народная Воля” не надрукуе мой ліст, то, баюся, памяць пра гэтых людзей можа знікнуць бясследна.

Пятро СЕРАДА.

г.Слонім.

ДУХОЎНАЯ ПОВЯЗЬ

Алесь САПЕГА: «Мой выбар – займацца справай на карысць Бацькаўшчыны»

У Беларусь даставілі помнік Тадэвушу Касцюшку. Яго прывёз **Алесь Сапега** – на сёння найактыўнейшы прадстаўнік беларускай дыяспары. Ён жыве ў Швейцарыі, але ўвесь час падтрымлівае адносіны з Бацькаўшчынай, якую наведвае па некалькі разоў на год разам з жонкай і дзецьмі. Дзякуючы яму ў Швейцарыі было заснавана згуртаванне беларусаў, якое ў мінулым годзе ўсталявала помнік Касцюшку ў горадзе Залатурн.

Акрамя таго, Алесь Сапега прывёз у Беларусь прах Магдалены Радзівіл, вялікай мецэнаткі ў справе Адраджэння, перазахаванне якой адбылося днямі. Пра сваю дзейнасць ён распавёў “Народнай Волі”.

– Чаму вы так шмат робіце на ніве беларускай справы?

– У мяне быў выбар: у вольны час хадзіць, як іншыя швейцарцы, у фітнес-клуб, падарожнічаць па свеце або займацца справай на карысць маёй Бацькаўшчыны. Я абраў апошняе. І пасля ўтварэння згуртавання беларускай дыяспары ў Швейцарыі гэтую ініцыятыву падтрымалі іншыя актыўныя людзі…

– Як узнікла ідэя перавезці прах Магдалены Радзівіл у Беларусь?

– Мы, прадстаўнікі дыяспары, задумаліся над гэтым яшчэ ў 2012 годзе, калі хадзілі на Дзяды прыбіраць яе магілкі ў швейцарскім Фрыбургу, дзе яна была пахавана. Менавіта там спаткалі яе нашчадка. Ён сказаў, што сям’я пераязджае ў Лондан і больш не можа быць прамым апекуном магілы Магдалены, якую могуць знішчыць. Было прынята рашэнне перавезці яе ў Беларусь. Яна і сама хацела быць пахавана ў Чырвоным касцёле ў Мінску. Былі, зразумела, свае складанасці, але мы іх вырашылі.

– Помнік Тадэвушу Касцюшку вы прывезлі ў Беларусь праз Украіну. З боку кіеўскіх улад не было перашкод?

– Перашкод не было, але ехаць па ўкраінскіх дарогах вельмі складана. Прабілі кола, сапсаваўся рухавік, баяліся, каб на ямах не пашкодзіць помнік…

– А як сустрэлі на беларускім баку?

– Вельмі добра. Я сказаў, што вязу помнік Тадэвушу Касцюшку, і ўсё было ўспрынята вельмі спагадліва. Такога ад беларускіх мытнікаў я яшчэ не бачыў.

– Калі плануеце ўсталяваць помнік Тадэвушу Касцюшку на яго радзіме ў Мерачоўшчыне?

– Калі не перашкодзіць надвор’е, то на пачатку сакавіка. Усё амаль гатова, івацэвіцкія ўлады толькі “за”.

– Ці бачыце змены з боку беларускіх улад да постаці Тадэвуша Касцюшкі з таго часу, як вы ініцыявалі ўсталяванне яму помніка ў Швейцарыі?

– Тэма Касцюшкі ў Беларусі ўсплывала заўсёды. Магчыма, пэўны ажыятаж вакол помніка ў Швейцарыі дазволіў беларускім уладам пераасэнсаваць сваё стаўленне да гэтай слыннай асобы нашай гісторыі. І, як вынік, лёс першага ў Беларусі помніка Касцюшку быў вырашаны станоўча цягам трох месяцаў. Дзяржава пайшла насустрач. І нам не трэба спыняцца. Чым больш у нас будзе паўставаць помнікаў такога кшталту, тым менш людзі будуць баяцца рабіць штосьці падобнае.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

У сне

Муж раніцой пачуў ад жонкі:
– Ты ў сне мне падарыў
пярсцёнкі!
– А будзеш слухацца мяне –
І футра падару
У сне.

Вырас

У жончыных вачах
За дзесяць год
Ён вырас,
Хоць жыццё пайшло на злом:
Спачатку – “коцік”,
Неўзабаве – “кот”,
І ўрэшце, натуральна,
Стаў “казлом”.

Няма праблем

Парою кажам недарэм
З іроніяй і здзекам мы:
– Як з “бабкамі” няма
праблем,
Няма праблем і з дзеўкамі…

Ускружыў галаву

На кампліменты
Маладзён мастак,
Таму прыгожых слоў
Казаў нямала
І галаву ўскружыў
Дзяўчыне так,
Што дзевяць месяцаў
Яе ванітавала…

Не згода, а адмова

Не маладзею год ад года,
І ззаду ўжо жыцця палова.
Таму мяне жанчыны згода
Пужае болей, чым адмова…

Баян

У складчыну рашылі мужыкі
Купіць баян.
Дасталі кашалькі…
Купілі. Замачыць баян пара.
Заглыкалі віна не
менш вядра.
Удосталь на баяне паігралі,
Услодыч паспявалі
“тралі-валі”.
Прачнуліся назаўтра
з пахмяла,
І галава
У кожнага гула.
Дзе грошы ўзяць,
Каб выветрыць дурман?
Падумалі і прадалі баян…

На жанчын і на віно

Жонка разлаваная дзяўбе
Мужа безадказнага штодня:
– Грошы ўсе
Ты траціш на сябе!
Ён урэшце выпаліў:
– Хлусня!
Грошы нашы
Трачу я даўно
Толькі на жанчын і на віно.

Пакуты

Пакуты зведвае здаўна
Мужык няшчасны беларускі:
Жанаты ён – няма віна,
Жыве адзін – няма закускі.

ПРЕМЬЕРА!

«Тоска». Возвращение

24 февраля на белорусскую сцену возвращается знаменитая опера Джакомо Пуччини «Тоска». Эта постановка «Тоски» на сцене Большого театра Беларуси будет уже шестой по счету!

«Опера «Тоска» – великое произведение, в котором удивительным образом сплетаются в единое целое драматургия и музыка. Талант Сарду, помноженный на гений Пуччини, феноменально воздействует на зрителя. Отнюдь не случайно именно эта опера одна из самых популярных в мире. Поэтому и мы не можем надолго забыть ее», – говорит главный режиссер театра, обладатель медали Франциска Скорины **Михаил Панджавидзе**. Именно он и возвращает в репертуар белорусского Большого шедевр Джакомо Пуччини.

“Вместе с командой!” – подчеркивает Михаил Александрович. А команда мощнейшая: итальянский маэстро **Джанлука Марчано**, главный приглашенный дирижер Большого театра, а также два лауреата Государственной премии Беларуси – художник-постановщик **Александр Костюченко**, обладатель медали Франциска Скорины, и хормейстер-постановщик, народная артистка Беларуси **Нина Ломанович.**

Сам Панджавидзе далеко не в первый раз обращается к этой опере. *“Кардинально менять ничего не собираюсь – ни время, ни место действия,* – продолжает Михаил Александрович. – *Потому что создать вневременное пространство здесь просто невозможно. В опере даны абсолютно точные даты, события, конкретные топонимы и имена…”* История будет разворачиваться в Риме летом 1800 года, как это и было задумано авторами.

«Я счастлив! – не скрывает эмоций итальянский маэстро, дирижер **Джанлука Марчано,** который вместе с Панджавидзе семь лет назад представил белорусской публике яркую оперу «Севильский цирюльник». – *Открыто скажу: Михаил Панджавидзе – редкий режиссер. Он смотрит на спектакль не только с точки зрения его драматического наполнения. Он действительно знает музыку того произведения, которое ставит. И понимает, что эти две вещи взаимосвязаны. А если мы говорим о Пуччини, это более чем важно. Закройте глаза, погрузитесь в его гениальную музыку – и воображение уже рисует происходящее в опере. Образность музыки Пуччини невероятна!..»*

Полина ПЛАТОНОВА.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Вачыма гісторыі

Адказ аднаму з чытачоў майго артыкула

Пасля публікацыі майго матэрыялу ў нумары газеты за 13 лютага пра Магдалену Радзівіл у аднаго з чытачоў (прозвішча па тэлефоне ён не назваў) узнікла пытанне наконт ужытага мною выразу «Руска-беларуская вайна 1792 года», што вымушае мяне патлумачыць сказанае.

Як вядома з гісторыі, другі падзел Рэчы Паспалітай ажыццяўляўся шляхам агрэсіі. 18 мая 1792 года пасол Расіі ў Рэчы Паспалітай Якаў Булгакаў уручыў міністру замежных спраў Храптовічу дэкларацыю аб уваходжанні ў краіну расійскіх войскаў. Рэч Паспалітая тады складалася з дзвюх незалежных рэспублік – Польшчы і ВКЛ, пераемнікамі якога мы сёння з’яўляемся. Зрэшты, сама Кацярына II забараніла выкарыстоўваць слова “літвін” і ўвяла ў абарот слова “беларус”, таму формула ВКЛ=Беларусь прыдумана не мною, яна ўстойлівая, як аксіёма, і не падлягае доказу. З гэтай формулы вынікае, што калі Расія ў той час напала на ВКЛ, то яна напала на Беларусь. (Зрэшты, было б дзіўна, калі б мы казалі, што Гітлер напаў на СССР, і не казалі, што Гітлер напаў на Беларусь.) Тая вайна дастаткова вывучана і даследавана ў Польшчы. Маецца шмат навуковых прац на гэту тэму. З беларускіх даследчыкаў адзначу Аляксандра Ярашэвіча. У нас жа па зразумелых прычынах гэта вайна не вывучалася, а замоўчвалася. І мы да сёння не маем уцямных тлумачэнняў, што тады адбывалася на тэрыторыі Беларусі. Між тым менавіта беларусы прынялі тады першы ўдар расійскіх войскаў, якія насоўваліся на нашы межы з поўначы.

Вайну чакалі. Напярэдадні па загадзе вялікага князя Станіслава Аўгуста быў праведзены спешны дадатковы набор рэкрутаў. Часу на высвятленне, адкуль іх браць, не было, таму бралі з духоўных уладанняў – Койданаўскай, Мінскай і іншых парафій. Асобная камісія займалася тэрміновым спагнаннем запазычаных падаткаў са шляхты.

Але... войны заўсёды прыходзяць знянацку. На вялікі жаль, праблемы з камплектам у харугвах былі нішто ў параўнанні са здрадай камандуючага беларускім войскам, наёмніка прынца Людвіка Вюртэмбергскага, які кінуў армію і збег за мяжу ў Саксонію. Харугвы былі размешчаны ў аддаленні адна ад адной, і іх палкоўнікам даводзілася самім прымаць рашэнні. З дакумента:

«Найяснейшы кароль, пане мой міласцівы!

Пакольні абавязкі вернага абывацеля неабмежаваныя, то, міласцівы пане, у тлуме данясенняў ёсць тыя, якія ўпэўнена атрымліваю з дому і дакладна пераказваю. Таму з упэўненасцю паведамляю, што ваявода Хамінскі (Мсціслаўскі ваявода Францішак Ксаверы Хамінскі сапраўды быў у змове з Расіяй, але пражыў да 1809 года. Пэўна, да Завішы дайшлі нейкія чуткі. Не выключана, што Хамінскі тады і сапраўды трапіў у нейкі пераплёт, але застаўся жыць) *раптоўна памёр пад Вільняй у Янішках, вяртаючыся з Пецярбурга. Пісаў генералу Забелу, каб знёсся з парадкавай камісіяй, апячатаваў і лісты, і рублі, і вэксалі, якія напэўна ў яго адшукаюцца, калі ментар-біскуп* (маецца на ўвазе тагачасны Віленскі біскуп Ігнась Масальскі, які таксама быў у хаўрусе з Расіяй), *які пры ім знаходзіцца, гэтаму не перашкодзіць. Міласцівы пане, не без прычыны раю прызначыць генерала Забелу на каманду ў Польшчу, каб не быў у Вільні. Каб жа, таксама, выдаць універсал з указаннем, што камісіі парадкавыя не лімітуюцца* (лімітацыя – прыпыненне дзейнасці), *аб гэтым мыслю ў найпатрэбнейшы час. Пра што толькі пэўнае даведаюся, рапартаваць не праміну, пакуль буду магчы. Мы аддаём сябе пакравіцельству вашай айцоўскай каралеўскай мосці ў час, калі наша жыццё і маёнткі ў крытычным стане, але ніколі не перастануць існаваць. Вершай* (Вершы (старапольск.) – вярхоўны) *каралеўскай мосці пана Міласцівага верны паддана Казімір Завіша, кавалер ордэнаў».*

Унізе злева прыпіска:

«Прыбылы з Барысава зараз губернатар (губернатар – у даўнія часы кіраўнік вялікіх маёнткаў магнатаў) *гетмана Агінскага сцвярджае, што Бобр адышоў маскве, перад якой ковенская брыгада пастаянна (адыходзіць) у тыл, да Мінска».*

Такое вось цікавае баявое данясенне. Адшукалася яно, дарэчы, у расійскім архіве. За што я ўдзячны архівістам, ды і ўсім людзям добрай волі гэтай краіны.

Даволі драматычныя гадзіны першых дзён вайны. Зразумела, што гэта была не гульня, абодва бакі неслі страты. У тыле беларускіх войскаў пачалося бежанства, хто мог, з’язджаў далей на захад. Многія ж не маглі гэтага зрабіць.

«Найяснейшы кароль, пан наш міласцівы!

Будучы вернымі нашай Маці-Айчыне, захоўваючы святасць яе правоў і застаючыся сярод найжахлівейшага няшчасця, не маем мы іншай мэты паратунку, як толькі перайсці да цябе, Найяснейшы Кароль. Пан наш міласцівы, найпакорней умольваем літасціва ўказаць нам той шлях, ідучы па якім мы маглі б захаваць табе, Найяснейшы Кароль, і Айчыне вернасць і ў дастойных рамках захаваць нашы цноты. На першую пагалоску аб уварванні масквы ў наш край мы глядзелі спакойнымі вачамі, бо народны жаўнер засланяў нас ад непрыяцельскага праследу, які мог адбыцца. На гэты раз у край увайшоў неспакой, які памнажаўся ў нас ступенямі аж да моманту жахлівага прыходу непрыяцеля ў наша Мінскае ваяводства, якое знаходзіцца без краёвага войска, без абароны. Да жахлівага моманту, кажам мы, бо толькі што мы атрымалі ад яснавяльможнага расійскага генерала Меліна, які знаходзіцца пры аптэкары Аршанскага павета, канвакацыйныя лісты для таемнай прысягі абывацеляў павета супраць Айчыны і зрынання прынятай Канстытуцыі. І каго ж з пачціва мыслячых не агаломшыла наскрозь гэта канвакацыя. Характар пачцівага абывацеля, які паказвае спакойную вернасць Айчыне і Каралю, можа стацца канчаткова скажоным. Не слухацца ж яе – неадкладна маёнткі, а можа, здароўе і жыццё будуць праследаваныя. Але мы, ідучы за цнотай, не задумваючыся ні над якой акалічнасцю, што пагражае нам, прысягаць на злучэнне з масквой не будзем. Але калі па дамах нашых нас сілай браць і весці да прысягі масква будзе, давядзі, Найяснейшы Пан, нам найхутчэйшую параду, як жа нам табе, Міласцівы Кароль, і Айчыне, захаваць вернасць? Калі ж да тваёй, Найяснейшы Пане, водпаведзі на нашу просьбу масква ўжо ўчыніць свой гвалт над намі і прысягнуць без прамаруджання загадае, не лічы, Найяснейшы Пане, нас за здраднікаў Айчыны, бо мы, седзячы па дамах з аказіі нешматлікасці нашага саслоўя ў мясцовасці, супрацьстаяць непрыяцельскаму насіллю не здолеем.

Робім загадзя нашу заяву для таго, каб мы, выкарыстаўшы ўсе апошнія звычайныя магчымасці для ўчынення рэцэсу прысязе, не былі праследаваныя і пагарджаныя нашай Айчынай. Між тым, калі з’явяцца спрыяльныя акалічнасці для вызвалення з-пад непрыяцельскага гвалту, неадкладна новы рэцэс у найбліжэйшых Актах абавязкова зробім.

Дадзены ў парафіі Краснасельскай у тысяча семсот дзевяноста другім годзе, у месяцы чэрвені, дзясятага дня.

Гэтыя просьбы падпісваем, верныя Каралеўскай Мосці падданыя:

Станіслаў Івашкевіч
Юзаф Валадковіч
Траян Свентаржэцкі
Габрыэль Куроўскі
Антон Стэцэвіч
Зыгмунд Глушынскі
Тадэвуш Ліхадзіеўскі
Казімір Златагурскі
Антон Івашкевіч
Ян Ясенскі
Ян Хаецкі
Вінцэнт М (прозвішча нечытэльна)
Юзаф Грынеўскі
Ігнась Панцэржынскі
Міхал Лагуновіч
Севярын Гальніцкі
Адам Лагіновіч
(Імя невыразна) Кашэўскі
Ян Кажухоўскі
Тадэвуш Палькоўскі
Дыяніс Шымкевіч
Сымон Кукель
Ануфрый Гнатоўскі
Антон Акуліч
Тадэвуш Стэцэвіч
(Імя невыразна) Стальніцкі».

Гэты дакумент, дарэчы, з польскага архіва. Дык, даруйце, з кім вялася вайна 1792 года? А за межамі ж гэтага дакумента былі баі пад Мірам і Зэльвай, трагічная абарона Вільні і шэраг іншых бітваў па адстойванні незалежнасці нашай тагачаснай дзяржавы. Дык ці правамоцныя мы называць вайну расійска-беларускай?

Не буду разгортваць тэму. Шчырасць у гістарычных даследаваннях вядзе да сяброўства. І я стаю на тым. Не трэба глядзець у мінулае вачамі ваўка. З рускім народам нас яднае шмат добрых спраў. Таму я ўпэўнены, што мы разам напішам праўдзіва і пра гэту старонку нашага агульнага мінулага.

Віктар ХУРСІК.

ЧУЛІ?

У Мінску запрацавала «Карта госця»

Сэрвіс прызначаны для індывідуальнага турыста, які жадае наведаць у сталіцы як мага больш музеяў і экскурсій.

Як паведамілі “Народнай Волі” ў “Мінгардаведцы”, калі чалавек набывае камплект “Карта госця”, то разам з пласцікавай смарт-картай ён атрымлівае і даведнік, у якім указаны адрасы, тэлефоны, графікі работы і ўмовы наведвання турыстычных аб’ектаў.

З дапамогай карты можна бясплатна пабываць у 11 мінскіх музеях і са зніжкай 50% наведаць яшчэ больш за 20 аб’ектаў – музеі, экскурсіі, аквапарк “Лябяжы” і заапарк.

“Карта госця” таксама прадастаўляе права атрымання зніжкі да 20 працэнтаў у атэлях, рэстаранах і кафэ, магазінах і на пракат аўтамабіляў, – дадаюць у “Мінгардаведцы”. – *Зніжкамі там можна скарыстацца на працягу трох гадоў пасля набыцця карты. Акрамя таго, яна прадастаўляе электронны праязны для аплаты паездак на гарадскім транспарце”.*

Кошт сэрвісу на 24 гадзіны – 45 рублёў, на 48 гадзін – 60, на 72 гадзіны – 78 рублёў.

Сяргей НІКАНОРАЎ.

Великий пост 2018:

календарь питания по дням

Великий пост начинается сразу после Масленицы и заканчивается перед Пасхой. В 2018 году пост продлится с 19 февраля по 8 апреля.

В Великий пост верующие не только ограничивают себя в пище, но и стараются не отвлекаться на суетное — в том числе на различные увеселения. Уместно отказаться от праздных развлечений — просмотра развлекательных телепрограмм, компьютерных игр, походов в кино на комедии, шумных посиделок в компании и т.д.

В это время под запретом мясо и все мясные продукты, молоко и молочные продукты, а также яйца и блюда из них.

Ограничивая себя в пище и в развлечениях, истинный христианин не должен этим гордиться ни перед собой, ни — особенно — перед другими, иначе это обессмысливает пост.

Предлагаем так называемый монастырский вариант питания в Великий пост — он является наиболее строгим и не обязательным для мирян. В пост следует есть побольше овощей и фруктов, бобовых, картофеля и т.д. Также стоит обратить внимание на каши, постные супы, сухофрукты, орехи, мед, кисели и морсы и т.д.



Первая седмица Великого поста 19 — 25 февраля

Понедельник 19 февраля	Вторник 20 февраля	Среда 21 февраля	Четверг 22 февраля	Пятница 23 февраля	Суббота 24 февраля	Воскресенье 25 февраля
						
Полное воздержание от пищи	Хлеб и вода	Сухоядение: сырая пища без масла	Полное воздержание от пищи	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом	Горячая пища с растительным маслом, вино

Вторая седмица Великого поста 26 февраля — 4 марта

Понедельник 26 февраля	Вторник 27 февраля	Среда 28 февраля	Четверг 1 марта	Пятница 2 марта	Суббота 3 марта	Воскресенье 4 марта
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом	Горячая пища с растительным маслом, вино


Третья седмица Великого поста 5 — 11 марта

Понедельник 5 марта	Вторник 6 марта	Среда 7 марта	Четверг 8 марта	Пятница 9 марта	Суббота 10 марта	Воскресенье 11 марта
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом	Горячая пища с растительным маслом, вино


Четвертая седмица Великого поста 12 — 18 марта

Понедельник 12 марта	Вторник 13 марта	Среда 14 марта	Четверг 15 марта (Благовещение)	Пятница 16 марта	Суббота 17 марта	Воскресенье 18 марта
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом	Горячая пища с растительным маслом, вино






Пятая седмица Великого поста 19 — 25 марта

Понедельник 19 марта	Вторник 20 марта	Среда 21 марта	Четверг 22 марта	Пятница 23 марта	Суббота 24 марта	Воскресенье 25 марта
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом	Горячая пища с растительным маслом, вино

Шестая седмица Великого поста 26 марта — 1 апреля

Понедельник 26 марта	Вторник 27 марта	Среда 28 марта	Четверг 29 марта	Пятница 30 марта	Суббота 31 марта (Лазарева суббота)	Воскресенье 1 апреля (Вербное воскресенье)
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища с растительным маслом, рыбная икра, вино	Горячая пища с растительным маслом, рыба и морепродукты, вино


Страстная седмица (2-8 апреля) – строгая седмица Великого поста 2018, каждый ее день носит собственное название. Также следует отметить, что в Страстную неделю пост усиливается и является действительно строгим.

Понедельник 2 апреля (Страстной понедельник)	Вторник 3 апреля (Страстной вторник)	Среда 4 апреля (Страстная среда)	Четверг 5 апреля (Страстной четверг)	Пятница 6 апреля (Страстная пятница)	Суббота 7 апреля Благовещение (Страстная суббота)	Воскресенье 8 мая (Воскресение Христово)
						
Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Сухоядение: сырая пища без масла	Горячая пища без масла	Полное воздержание от пищи	Горячая пища с растительным маслом	Пасха, окончание Великого поста

КРЫЖАВАНКА

Мастак слова

Прысвячаецца 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага.



Па гарызанталі: 2.Старажытны горад на Магілёўшчыне непадалёк ад якога, у вёсцы М.Багацькава, 125 год таму нарадзіўся адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы, педагог, гісторык, літаратуразнаўца, дзеяч беларускага нацыянальнага руху пачатку XX стагоддзя Максім Гарэцкі. 6.Дарожка ў парку. 8.Народная … – вышэйшы дзяржаўны орган Беларускай Народнай Рэспублікі, членам прэзідыума якой з'яўляўся М.Гарэцкі. 9.Той. хто выкладае ў навучальнай установе; ім быў і М.Гарэцкі, калі працаваў у школах і гімназіі, чытаў лекцыі ў Белдзяржуніверсітэце, у Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. 12. … Кузьміч – імя бацькі пісьменніка, а таксама імя аднаго з яго братоў. 13. … слова – такім высокім эпітэтам адзначыў Максім Багдановіч М.Гарэцкага як пісьменніка. 14.Канат. 17. … – сход беларускіх настаўнікаў; ён адбыўся ў Вільні (зараз – Вільнюс) у 1923 годзе, і ў ім бралі ўдзел Максім са сваёй жонкай – пісьменніцай, педагогам Леанілай Чарняўскай-Гарэцкай. 18.Народнае эпічнае апавяданне. 21.Кантора, канцылярыя. 22.Імя дачкі Гарэцкіх, якая ўсё жыццё захоўвала архівы сваіх бацькі і дзядзькі, выдатнага беларускага вучонага-геолага Гаўрылы Гарэцкага (сын Максіма і Леанілы Леанід загінуў на фронце ў 1944 годзе). 25.Мара, летуценне. 26. …, або Грамніцы, Стрэчанне, – прысвятак беларускага народнага календара, які адзначаўся 15 лютага. 28.Георгіеўскі … – высокая ўзнагарода, якой быў узнагароджаны салдат М.Гарэцкі за мужнасць, праяўленую на франтах Першай сусветнай вайны. 29.Назва парламента ў некаторых дзяржавах. 30."… беларускае літаратуры" – праца, напісаная М.Гарэцкім у 1920-х гадах, якая цэлае дзесяцігоддзе была падручнікам у школах, тэхнікумах, універсітэце.

Па вертыкалі: 1. …Беларус – адзін з псеўданімаў М.Гарэцкага, пад якім у 1913 г. у газеце "Наша Ніва" выйшаў першы твор пісьменніка – апавяданне "У лазні". 3. … (сапраўдн.Алаіза Пашкевіч) – паэтэса, грамадскі дзеяч, якая ў якасці медыцынскай сястры даглядала М.Гарэцкага ў віленскім шпіталі, куды ён трапіў пасля цяжкага ранення на фронце. 4.Невялікае паглыбленне ў чым-небудзь. 5.Літаратурныя творы ў форме мемуараў, успамінаў, якія былі напісаны М.Гарэцкім у 1926 г. пад назвай "На імперыялістычнай вайне". Тэме вайны пісьменнік прысвяціў таксама апавяданні "Генерал", "Рускі", "На этапе", "Літоўскі хутарок". 7.Мужчынскае імя. 10.Пераемнік , прадаўжальнік справы. Вартым … свайго бацькі, вядомага геолага, вязня сталінскіх лагераў Гаўрылы, і свайго дзядзькі Максіма з'яўляецца беларускі геолаг, акадэмік, аўтар больш як 500 навуковых прац, вядомы грамадскі дзеяч, адданы сын Беларусі Радзім Гарэцкі, 90-годдзе якога Беларусь будзе адзначаць у гэтым годзе. 11.Пісьменнік, які піша творы для пастаноўкі на сцэне; М.Гарэцкі напісаў п'есу "Жартаўлівы Пісарэвіч", драматычныя абразкі "Антон", "Атрута", "Чырвоныя ружы", а паводле яго аповесці "Дзве душы" ў тэатры імя Я.Купалы быў пастаўлены аднайменны спектакль. 15.Частка тэксту, напісаная або надрукаваная ў адну лінію. 16."Народныя … з мелодыямі" – зборнік, які М.Гарэцкі склаў з беларускіх песень, запісаных ад маці Ахрасінні, якая ведала іх шмат; мелодыі песень запісалі кампазітары М.Аладаў і А.Ягораў. 19."Камароўская …" – незавершаны раман, "лебядзіная песня" пісьменніка; раман быў надрукаваны толькі ў 1966 г. у часопісе "Полымя". 20.Горад у Смаленскай вобласці, дзе 80 год таму як "вораг народа" сталінскімі катамі быў расстраляны выдатны сын беларускага народа Максім Гарэцкі. Рэабілітаваны ў 1957 годзе. Вуліцы з яго імем ёсць у Мінску, Мсціславе, Горках. У Вязьме і Мінску яму ўсталяваны помнікі. 23.Грошы, што выдаюцца ў лік будучых плацяжоў. 24.Прыбытак ад чаго-небудзь (перан.). 27.Вялікі майстар сваёй справы (перан.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. *г.Дзяржынск.*

Адказы. Па гарызанталі: 2.Мсціслаў. 6.Алея. 8.Рада. 9.Настаўнік. 12.Іван. 13.Мастак. 14.Трос. 17.З'езд. 18.Сказ. 21.Офіс. 22.Галіна. 25.Мроя. 26.Грамавіца. 28.Крыж. 29.Сейм. 30.Гісторыя.

Па вертыкалі: 1.Максім. 3.Цётка. 4.Лунка. 5.Запіскі. 7.Ян. 10.Наследнік. 11.Драматург. 15.Радок. 16.Песні. 19.Хроніка. 20.Вязьма. 23.Аванс. 24.Навар. 27.Ас.

Адрас рэдакцыі:
220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.


9 772071 964000 18015

Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 19.02.2018 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 24 010 экз. Заказ № 572.